

ФАРМАЦЭЎТЫЧНЫЯ АДХОДЫ – ГЛАБАЛЬНАЯ ПАГРОЗА **11**

ПЕРШЫ, ХТО НАЗВАЎ СЯБЕ БЕЛАРУСАМ **12**




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

22 СНЕЖНЯ 2020 г. АЎТОРАК № 249 (29363)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый ПІНЕВІЧ, міністр аховы здароўя:**

*«Мы зараз з асцярожным аптымізмам ужо тыдзень, можа, крыху больш, гаворым, што не бачым росту колькасці пнеўманій. У асобных рэгіёнах няма неабходнасці трымаць той ложкавы фонд, які быў перапрафіляваны, у тым ліку з лёгкім запасам (для прыёму пацыентаў з COVID-19). Таму бальніцы, у прыватнасці Магілёўскай, Віцебскай і Брэсцкай абласцей, аднаўляюць звычайны рэжым працы. Па іншых рэгіёнах мы пакуль не будзем спяшацца».*

## КОРАТКА

- **Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Каранік узнагароджаны ордэнам Айчыны III ступені, Міністр аховы здароўя Дзмітрый Піневіч — ордэнам Пашаны.**
- Урад РФ адобрыў праект пагаднення аб выдзяленні Беларусі крэдыту на $1 млрд.
- **Прызыўная кампанія ў Беларусі прадоўжана ў сувязі з эпідсітуацыяй.**
- Мінэнерга плануе за 2021 год ацаніць магчымасць будаўніцтва другой АЭС у Беларусі.
- **Чарговы раўнд перагавораў Беларусі і Расіі па пастаўках газу плануецца на гэтым тыдні.**
- У Беларусі за выхадныя пад коламі аўто адзін чалавек загінуў і 18 траўміраваных.
- **Праграму па павелічэнні спажывання насельніцтвам электраэнергіі плануецца прыняць у 2021 годзе.**
- Нацбанк падоўжыў на год ТК Банку прыпыненне ліцэнзіі на прыцягненне ўкладаў фізічных асоб.


ISSN 1990 — 763X


# Прадавец добрага настрою




Учора ў Мінску і сталічнай вобласці пачалі працаваць сезонныя (дзесяцідзённыя) кірмашы, дзе галоўны тавар — навагодняя ёлка. На перакрыжаванні мінскіх вуліц Магілёўскай і Жукоўскай размясціўся невялікі базарчык, загарадку якога ўпрыгожвае вывеска са словамі, знаёмымі кожнаму з маленства. Рэалізацыяй пушыстых прыгажунь тут займаецца Арцём БІРЫЛА. Дарэчы, не першы сезон Арцём заняты пераднавагоднім гандлем і ведае, як прывабіць пакупнікоў: ласкава пагаварыць, шчыра ўсміхнуцца! Пакуль пакупнікі прыглядаюцца да маленькіх і высокіх дрэўцаў, да цэн на іх, але ўжо напярэдадні першых Каляд пачнуць актыўна набываць.

— Не проста рэалізоўваю хвойную прадукцыю. Я, між іншым, — прадавец святочнага настрою і пазітыўных эмоцый, — усміхаецца наш герой.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## Год малой радзімы: вынікі

**Мікалай ШАРСНЁЎ:**

# «Усё дзеля паляпшэння жыцця людзей!»

**Як прайшла трылогія Года малой радзімы на Віцебшчыне? Якія цікавыя праекты рэалізавалі? А можа, некаторыя атрымаюць працяг? Ці з'явіліся ідэі, якія ў бліжэйшым будучым плануюць ажыццявіць? Што такое малая радзіма асабіста для губернатара, які нарадзіўся на Віцебшчыне? І якія папярэднія вынікі працоўнай пяцігодкі? Пра гэта і іншае карэспандэнт «Звязды» пагутарыў са старшынёй Віцебскага аблвыканкама Мікалаем Шарснёвым.**



***— Вы родам з Аршаншчыны. Ці часта бываеце на сваёй малой радзіме? Што згадваеце пра часы, калі вы жылі там, у тыповай беларускай глыбінцы?***

— Я нарадзіўся ў вёсцы Прыгузкі. Гэта невялікая вёсачка. Сёння там крыху больш за паўсотню дамоў, з іх жылымі засталася толькі палова.

У школу хадзіў у суседнюю вёску Барздоўка, дзе цяпер настаўнікі-энтузіясты стварылі Музей гісторыі роднай вёскі, за што я ім вельмі ўдзячны. У ім жывуць дух мінулай эпохі і аптымістычны погляд у будучыню. Рэдкае адчуванне, якое дарагога варта...


**СТАР. 4-5**


## На слыху

# 100 АДЦЕННЯЎ БЕЛАГА...

**Выпадковы здымак на мабільны, зроблены ў памяшканні для пераапранання медыкаў ковіднай зоны бальніцы, кранае сэрца. На ім — злоўленае імгненне. На мове адных толькі позіркаў чытаецца незвычайная пяшчота. Усё проста: матуля-ўрач прыбірае калегу-дачку ў асляпляльна белы ўбор і дае нямы наказ. «Звязда» адшукала герояў здымка на Гомельшчыне, у горадзе Рэчыца.**

### Пароль — «валанцёр»

Упершыню ў Беларусі студэнцкі валанцёрскі атрад барацьбы з COVID-19 Гомельскага дзяржмедуніверсітэта быў накіраваны на дапамогу ўрачам менавіта Рэчыцкай цэнтральнай раённай бальніцы. Добраахвотнікі — у пераважнай большасці ўраджэнцы райцэнтра, студэнты лячэбнага факультэта гомельскага «меда». Галоўным «сувязным» для валанцёраў у рабоце ў інфекцыйных аддзяленнях бальніцы і іх куратарам у «чырвонай» зоне стала Таццяна Лазарэвіч. У адной асобе — урач-тэрапеўт і загадчык інфекцыйнага аддзялення № 2 Рэчыцкай ЦРБ. Сюды на лячэнне трапляюць пацыенты з COVID-19.


**СТАР. 6**



**Кожны дзень – са «Звяздой»!**

**Усім, хто падпісаўся на І квартал або І паўгоддзе 2021 года, — у падарунак чатыры календары — маляўнічы насценны, рэлігійны, народны і месяцовы**



З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# Новы кіраўнік мытнага камітэта і намеснікі міністраў — кадры ў Палацы Незалежнасці

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прызначыў Уладзіміра Арлоўскага старшынёй Дзяржаўнага мытнага камітэта, Аляксандра Румака — упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцяў.**

Гэтыя пасады кіраўнік краіны назваў надзвычай важнымі сёння ў сілу абставін у Беларусі і з эканамічнага пункту гледжання (што датычыцца ДМК).

Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што прызначыць новага старшыню мытнаму ведамству неабходна было даўно, але ўзніклі пытанні з кандыдатурамі. На карысць Уладзіміра Арлоўскага, адзначыў ён, гаворыць прафесіяналізм і рэпутацыя апошняга як аднаго з найлепшых спецыялістаў у мытных органах.

Прызначаючы на новую пасаду Аляксандра Румака, Прэзідэнт выказаўся наконт некаторых кіраўнікоў рэлігійных супольнасцяў, заўважыўшы, што яны памыліліся і зарэкамендавалі сябе не вельмі добрым чынам. «Але вінаваціць іх і не бачыць сваіх праблем і недахопаў — гэта не наш шлях. Таму вам трэба разабрацца, у чым мы, дзяржава, не дапрацавалі. І праваслаўныя, і каталікі — гэта нашы людзі, адданыя дзяржаве. У тым ліку і каталікі, падкрэсліваю. Таму да людзей трэба адносіцца з вялікай павагай і не парушаць рэлігійныя пачуцці чалавека», — паставіў задачы ўпаўнаважанаму па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Прэзідэнт.

Кіраўнік краіны заклікаў супыняць тых, хто разбурае мірнае жыццё народа і працуе на шкоду дзяржаве, у тым ліку і ў рэлігійным асяроддзі. «Мы не ўмешваемся ў рэлігійныя пачуцці людзей. Але мы павінны абараняць сваю дзяржаву», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Пасаду ўпаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў ён назваў ключавой, таму кандыдатуру падбіралі вельмі акуратна: «Мы сышліся на тым, што вы як чалавек вопытны, які шмат разумее, аднолькава роўна ў сваім жыцці да ўсіх нацыянальнасцяў і канфесій, зможаце працаваць з усімі канфесіямі і ў цесным кантакце з Адміністрацыяй Прэзідэнта, каб не разбурыць тое, чым мы заўсёды ганарыліся».

Абнаўленні былі і сярод кіраўнікоў мясцовых выканаўчых органаў. Дзяніс Дзішук узгоднены старшынёй Бярэзінскага райвыканкама. Юрый Панфілаў, кіраўнік Чыгуначнага раёна горада Віцебска, узгоднены на аналагічную пасаду ў Кастрычніцкі раён. Аляксей Героеў, кіраўнік Кастрычніцкага раёна Віцебска, зойме пасаду Юрыя Панфілава.

У рабочым парадку ўзгоднены на новых пасадах першы намеснік міністра аховы здароўя Алена Богдан, намеснік міністра аховы здароўя Дзмітрый Чараднічэнка, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Іван Лаўрыновіч і намеснік міністра эканомікі Сяргей Міцянскі. Міхаіл Грыб парэкамендаваны на пасаду члена Мінгарвыканкама.

**Марыя ДАДАЛКА.**

**• У тэму**

**Уладзімір АРЛОЎСКІ, старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта:** «Мы будзем працягваць пачынанні: галоўны кірунак — электронная мытня. Мы будзем і далей укараняць электронныя тэхналогіі. Галоўная задача, каб беларускі экспарт афармляўся за хвіліны і імпартная сыравіна, камплектуючыя для нашай вытворчасці афармляліся ў кароткія тэрміны. Цяпер адпрацоўваем эксперыментальныя тэхналогіі з адпраўленнем грузу, які знаходзіцца ў адным пункце адпраўлення, а супрацоўнік — у зоне дзейнасці іншай мытні».

Па словах старшыні ДМК, пяць гадоў таму імпартны тавар афармлялі 1-2 дні. Сёння амаль 80 % такіх грузаў афармляюцца на працягу не больш, чым дзвюх гадзін.

Як адзначыў Уладзімір Арлоўскі, закрыццё граніцы для грамадзян ніяк не адаб'ецца на грузапатоку мытні: «Нягледзячы на пандэмію каранавіруса, транзіт і грузапаток у нас унутры краіны не паменшыліся. Засталіся на ўзроўні мінулага года. Грузы ідуць. Людзі, што афармлялі фізічных асоб праз граніцы, узмоцняць грузавы паток».

**Аляксандр РУМАК, упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў:** «Этнаканфесійны мір і згода ў Беларусі з'яўляюцца стрыжнем дзяржаўнай палітыкі. На працягу стагоддзяў на беларускай зямлі жылі людзі розных нацыянальнасцяў, розных веравызнанняў. Сёння ў нас прадстаўнікі 25 канфесій, і галоўнае, што дзяржава забяспечвае свабоду веравызнання для кожнага чалавека».

Аляксандр Румак дадаў, што на працягу года гучалі ацэнкі быццам бы прыцяснення пэўных канфесій. «Але ў кожным выпадку канкрэтныя людзі адказвалі за свае ўчынкі. Я думаю, ні разу не было чутно, каб у нас зачынілі нейкі храм і людзі не мелі магчымасці памаліцца», — сказаў упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў і дадаў, што далей яго работа будзе накіравана на захаванне міжканфесійнай згоды.

**Дзяніс ДЗІШУК, старшыня Бярэзінскага райвыканкама:** «Прэзідэнт сёння даў дакладна зразумець, што ў нас каштоўны кожны чалавек і мы ўсе на вачах. Трэба ўсё адсочваць, каб было бачна, што ўлада працуе». Новы кіраўнік раней не быў знаёмы з рэгіёнам, у які накіруецца, але чуў, што там добрыя людзі і выдатная эканоміка.

# ПАЛАЦ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ ПРЫМАЕ ГАСЦЕЙ

## Удзельнікі аўтапрабегу наведалі Рэзідэнцыю Прэзідэнта

**Удзельнікі аўтапрабегу «За адзіную Беларусь» 19 снежня наведалі Палац Незалежнасці. Гэты пункт у традыцыйным прабегу з'явіўся ўпершыню. Як адзначыла прэс-сакратар Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Наталля Эйсмант, ініцыятыву прыняць гасцей у Палацы Незалежнасці праявіў сам кіраўнік дзяржавы. І праз прэс-сакратара прапанаваў усім у гэты суботні вечар «адчуваць сябе паўнавартаснымі гаспадарамі Палаца».**



Фота БелТА.

Дарэчы, экскурсійныя групы Палац Незалежнасці прымае з самага адкрыцця ў 2013 годзе. За гэты час сэрца краіны наведалі многія міжнародныя дэлегацыі і тысячы беларусаў, якія адзначыліся ў розных прафесійных сферах. У канцы 2020 года пачынаецца чарговы сезон экскурсій.

Дзве групы экскурсантаў, усяго каля 100 чалавек, наведалі залы, якія прымаюць найважнейшыя палітычныя і ўрачыстыя падзеі рэспубліканскага і міжнароднага маштабу. Больш за ўсё наведвальнікаў уразілі пратакольныя залы, якія раней многія бачылі толькі ў навінах. Напрыклад, знакамітая Зялёная зала, якая ўжо ўвайшла ў сусветную гісторыю. Менавіта тут у 2015 годзе адбыліся перагаворы лідараў краін «нармандскай чацвёркі» — Расіі, Германіі, Францыі і Украіны. Экскурсанты пазнаёміліся з любімай залай Прэзідэнта — Камінная, папулярнай падчас размоў са славутымі гасцямі. А ў Чырвонай зале, дзе прымаюцца важныя для краіны рашэнні, госці Палаца змаглі нават пасядзець у прэзідэнцкім крэсле.

«Вельмі важна і ганарова знаходзіцца ў такім месцы. Вельмі хочацца, каб як мага больш людзей наведала Палац Незалежнасці, бо гэта багацце нашага народа. Рэальнасць пераўзышла ўсе чаканні. Гэта не проста помнік, а нібыта жывы арганізм, дзе ўсё зроблена з любоўю і дзе ўсюды адчуваецца чалавечае цяпло», — падзялілася ўражаннямі Наталля Лядзінская.

Безумоўна, важнай часткай экскурсіі па Палацы Незалежнасці сталі шматлікія сэлфі і фотаздымкі ў інтэр'ерах. А пастаянныя ўдзельнікі аўтапрабегаў Аляксандр і Алена Барановічы ўсю экскурсію здымалі на відэа. Кажуць, для таго, каб захаваць на памяць і паказаць усё, што бачылі, сябрам, знаёмым, дзецям і ўнукам. «Вельмі кранальна і радасна пабываць у сэрцы краіны. Больш за ўсё здзівіла, што 90 працэнтаў усяго, што ёсць у палацы, зроблена з беларускіх матэрыялаў так прыгожа і якасна», — адзначыла сям'я Барановічаў.

Для некаторых удзельнікаў экскурсіі наведванне Палаца Незалежнасці стала своеасаблівым сюрпрызам. Як прызнаўся Станіслаў Яскевіч, ён са сваімі сябрамі-аднадумцамі да апошняга не верылі, што праўдзіўць выхадны дзень у такім знакавым для краіны месцы. А Ірына Сінькевіч адзначыла, што нават уявіць не магла, што калісьці наведае Палац Незалежнасці.

Наведвальнікі Палаца ўбачылі, дзе запісваецца навагодні зварот Прэзідэнта, дзе праходзяць сустрэчы з замежнымі журналістамі, ацанілі карцінную галерэю і падарункі, якія атрымлівае кіраўнік дзяржавы. Акрамя цікавых фактаў непасрэдна пра сам Палац, экскурсанты даведаліся шэраг цікавых гісторый пра мерапрыемствы, якія ў ім праходзілі.

Кожнага з удзельнікаў экскурсіі цікавіла рознае — інтэр'еры Палаца, фотаздымкі, гісторыі. Але ўсіх аб'ядноўвала захапленне вечарам выхаднога дня.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Еўропа адгароджваецца ад Вялікабрытаніі

Усё больш краін прыпыняе чыгуначнае і авіяцыйнае злучэнне з Брытаніяй з-за новага штама каранавіруса VUI-202012/01. Яго з'яўленне насцярожыла СААЗ, эксперты якой знаходзяцца ў пастаянным кантакце з брытанскімі спецыялістамі, паведаміла «Бі-бі-сі». За межамі Брытаніі ўжо было выяўлена больш за дзесяць выпадкаў распаўсюджвання новага штама — у Даніі, Нідэрландах, Аўстраліі і Італіі. Сярод краін, якія закрылі шляхі зносін з Вялікабрытаніяй, таксама Францыя, Германія, Аўстрыя, краіны Балтыі, Швейцарыя і Турцыя. Ізраіль закрыў уезд у краіну з Брытаніі для ўсіх, акрамя ізраільцян. З'яўленне і хуткае распаўсюджванне новага штама ў Брытаніі прымусіла ўлады змяніць планы на Каляды і Новы год і ўвесці больш жорсткую, чацвёртую, ступень лакдаўна. На думку экспертаў, цяперашні штам, хутчэй за ўсё, з'явіўся ў пацыента з аслабленай імуннай сістэмай, які не змог перамагчы вірус і замест гэтага стаў сваёго роду спрыяльным асяроддзем для мутацыі. Між тым, як паведаміла «Бі-бі-сі», новая «мадэль» ковіда сапраўды распаўсюджваецца вельмі хутка, так што ўлады вымушаны трымаць сітуацыю пад пільным кантролем, каб не дапусціць перагрузкі бальніц.

## Шахцёры ўранавых шахт Украіны аднавілі акцыю пратэсту



Некалькі дзясяткаў работнікаў уранавых шахт Кіраваградскай вобласці заблакіравалі аўтамабільны рух на трох міжгародніх трасах, патрабуючы пагасіць даўгі па заробках (складае цяпер каля 83 мільёны грыўняў (амаль $3 млн), а таксама выступаюць супраць вывядзення прадпрыемстваў у рэжым прастою. Пра гэта паведаміў ТАСС кіраўнік Незалежнага прафсаюза гарнякоў Украіны Міхаіл Валынец. «Пачалі бестэрміновую акцыю пратэсту работнікі дзяржаўнага прадпрыемства «Усходні горна-абагачальны камбінат» (горад Жоўтыя Воды Днепрапятроўскай вобласці)», — сказаў Валынец. Паводле яго слоў, гарнякі пастаянна ходзяць праз дарогу па пешаходным пераходзе і прапускаюць толькі спецтранспарт.

## Сатурн і Юпітэр злучыліся ў «віфлеемскую зорку»



У дзень зімовага сонцастаяння адбылася ўнікальная астранамічная з'ява: дзве звышмасіўныя планеты — Сатурн і Юпітэр — падышлі на начным небасхіле адна да адной настолькі блізка, што з пункту гледжання зямнога назіральніка выглядаюць суцэльнай яркай зоркай. Гэта сама па сабе рэдкая з'ява сёлета асаблівая па некалькіх прычынах. Па-першае, так блізка гэтыя дзве планеты апошні раз сыходзіліся прыкладна 800 гадоў таму. Па-другое, той факт, што іх злучэнне адбылося 21 снежня — якраз напярэдадні Каляд — спарадзіла тэорыі пра тое, што, магчыма, менавіта злучэнне Юпітэра і Сатурна апісана ў Новым Запавеце як Віфлеемская зорка, якая ўзышла каля 2000 гадоў назад і стала прадвеснікам нараджэння Ісуса Хрыста. Рэдкую з'яву можна назіраць цягам пяці дзён. Варта арыентавацца на сузор'е Казярога. Пры гэтым можна скарыстацца адной са шматлікіх астранамічных праграм з дапоўненай рэальнасцю для смартфонаў, накшталт Star Walk, якія дапамагаюць сарыентавацца на карце зорнага неба.



# МАЛІТВА АБ МІРЫ

## Напярэдадні калядных і навагодніх свят чатыры самыя буйныя канфесіі Беларусі падпісалі зварот

«Набліжаюцца радасныя святочныя дні, якія заўсёды адзначаюцца ў нашай краіне ў духу свету, узаемапавагі і добрасуседства. Шлях да міру і згоды быў доўгі, праз скруху і выпрабаванні. Жахі войнаў і хаос супрацьстаянняў, якія пачыналіся са спрэчак аб праўдзе, пераканалі нашых продкаў, што мір на зямлі, дзе Бог вызначыў жыць разам людзям розных нацыянальнасцяў, рэлігій і поглядаў, ёсць самая галоўная задача і ўрок чалавечага жыцця. Таму нашы продкі будавалі храмы на адных вуліцах, разам абаранялі Радзіму, — гаворыцца ў звароце. — Кожны з нас веดае: каб любіць Бога, трэба навучыцца любіць чалавека. У гісторыі было шмат людзей, якія сваёй дабрынёй ратавалі іншаверцаў, людзей іншых перакананняў. Наша сумесная гісторыя багатая шматлікімі прыкладамі ахвяравання дзеля таго, хто побач».

Як адзначаецца ў сумесным звароце чатырох канфесій да беларусаў, адзіным для ўсіх рэлігій з'яўляецца паняцце міру і любові да бліжняга. «Значыць ва ўсіх нас, такіх розных, ёсць агульнае, што можа дапамагчы ўбачыць у нядобразычліўцу ці варожа настроенага супраць нас не ворага, а бліжняга. Дабрынёй і любоўю да Бога, ядналнем сеецца мір на зямлі, але найперш ён пасяляецца ў адкрытым і чыстым ад граху сэрцы асобнага чалавека. Мудрасць нашых продкаў вучыць нас жыць з малітвай да Бога, з павагай да бацькоў і старэйшых, з клопатам пра дзяцей і бедных, з павагай да бліжняга і любоўю да нашага агульнага дому, — нагадваюць аўтары звароту. — Завяршаецца каляндарны год, і мы звяртаем наша слова любові з пажаданнем да кожнага суайчынніка і заклікаем да міру, да даравання і прымірэння; заклікаем забыць крыўды і працягнуць будаваць наш агульны дом зноў і разам. Кожны народжаны па благаславенні звыш хай будзе варты быць у ім жаданым жыхаром, суседам, сябрам, сваяком і блізкім чалавекам».

Зварот чатырох канфесій да беларусаў аб міры падпісалі мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Веньямін, апастальскі нунцый, арцыбіскуп Антэ Ёзіч, старшыня Мусульманскага рэлігійнага аб'яднання ў Беларусі муфцій Абу-Бекір Шабановіч і галоўны рабін Аб'яднання іўдзейскіх рэлігійных абшчын Дойч Шнэер Заламан.

Спажывец

# ДА ТРОХ ПРАЦЭНТАЎ УСЁЙ ПРАДУКЦЫІ — ПАДРОБКА

## А шкода сусветнай эканоміцы ад такога кантрафакту за мінулы год перавысіла 500 млрд долараў

**Пра гэта паведаміў на VIII Міжнародным форуме «Антыкантрафакт-2020» (які праводзіцца сёлета ў гібрыдным — вочным і віртуальным — фармаце) старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях краіны Аляксандр ШУМІЛІН.**

Па яго словах, рынак незаконнай прадукцыі імкліва расце. Шкода ад кантрафакту ў сусветнай эканоміцы — да 3 % ВУП. Старшыня Дзяржкамітэта звярнуў увагу, што пытанні кантрафакту і антыкантрафакту актуальныя для ўсяго свету. Калі гэтаму злу не процідзейнічаць, то, паводле ацэнак экспертаў, толькі ў IT-сферы, якая хутка развіваецца, да 2022 года шкода можа перавысіць 850 млрд долараў.

Гэта вялікія лічбы, менавіта таму пытанні процідзеяння падробленай прадукцыі важныя для ўсіх дзяржаў. Нягледзячы на тое што сітуацыя ў Беларусі складваецца дастаткова спрыяльная, гэтая праблема агульная.

«Як спажыўцы, мы хацелі б купляць прадукцыю, у якой упэўненыя на 100 %, — падкрэсліў Аляксандр Шумілін. — Напрыклад, купіць хтосьці кантрафактныя лекі — яны не толькі не будуць лячыць, але і нашкодзяць».

Ён адзначыў, што сярод традыцыйных сфер, дзе квітнеюць падробкі, — алкагольная прадукцыя (у некаторых краінах — да 40 % рынку), тытунёвыя вырабы (15 %), адзенне і бытавая тэхніка. «Як ні парадаксальна, да 30 % дзіцячых цацак на сусветным рынку — гэта кантрафакт. Дзеці — наша будучыня, і тое, з чым яны гуляюць, важна для нас. Таму экспертам неабходна разглядаць падобныя пытанні і выпрацоўваць механізм процідзеяння незаконнаму абароту», — адзначыў спадар Шумілін. Паводле яго слоў, у Беларусі прадаецца кантрафактная прадукцыя, але яе няшмат. Затое за мяжой нярэдка падрабляюць якасныя прадукты харчавання беларускіх вытворцаў. «Мы з гэтай з'явай змагаемся. А пра сябе адзначаем: раз іх падрабляюць на іншых рынках, то гэта пацвярджае іх якаснасць і запатрабаванасць».

Старшыня камітэта расказаў, што за апошні час адзначаны сур'ёзныя зрухі ў абароне інтэлектуальнай уласнасці, у прыватнасці ўсё часцей выкарыстоўваецца ліцэнзійнае праграмнае забеспячэнне. Што датычыцца фальшывай алкагольнай прадукцыі, то тут беларусам таксама няма патрэбы хвалявацца: рынак надзейна абаронены ад падробак.

У нашай краіне дзейнічае каля 10 законаў, якія рэгламентуюць агульныя пытанні інтэлектуальнай уласнасці. З 24 міжнародных дагавораў наша краіна падпісала 17. У найбліжэйшы час будзе падпісаны 18-ы — дагавор аб прамысловых узорах. Акрамя таго, у Беларусі пры падтрымцы Сусветнай арганізацыі інтэлектуальнай уласнасці і Еўразійскай патэнтнай камісіі распрацоўваецца канцэпцыя развіцця інтэлектуальнай уласнасці да 2030 года.

**Сяргей КУРКАЧ.**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## КАЛІ ЎСЕ ДОМА

### Сямейны дзіцячы дом адкрылі ў Ляхавічах

**Ён трэці па ліку ў раёне, паведамляе газета «Ляхавіцкі веснік». Бацькамі-выхавальнікамі гэтага дома сталі Кацярына і Дзмітрый КРАЎЧЭНІ.**



Фота з сайта газеты «Ляхавіцкі веснік».

У сужэнцаў ёсць трое сваіх дзяцей ва ўзросце ад 6 да 12 гадоў. На выхаванне яны ўзялі яшчэ чацвёра дзяцей з адной сям'і, якія засталіся без апекі бацькоў. Маці вялікай сям'і — настаўніца па адукацыі, бацька — юрыст.

Дом у райцэнтры для вялікай сям'і ўзвялі за рэкордныя дзевяць месяцаў. Двухпавярховы катэдж аснашчаны ўсім неабходным: мэбляй і бытавой тэхнікай. Дом у Ляхавічах стаў 57-м домам сямейнага тыпу ў Брэсцкай вобласці. Да канца года плануецца здаць яшчэ адзін такі дом у Ленінскім раёне Брэста.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## ЦІКАВА АДПАЧЫЦЬ!

### У віцебскай ратушы ўпершыню распачаўся крэатыўны навагодні праект

**Каля дваццаці найлепшых мастакоў, дызайнераў, рамеснікаў, мылавараў і кандытараў Віцебска прадставілі свае работы на першай выстаўцы-кірмашы «Навагоднія падарункі».**

Большасць майстроў — пастаянныя ўдзельнікі знакавых кірмашоў, такіх як «Віцебскі вернісаж», «Чароўны млын» (г. Мінск) і мноства іншых, якія праходзяць у краіне і за мяжой. Аўтарская кераміка, стыльныя ўпрыгажэнні, цацкі з экалагічных матэрыялаў і мішкі Тэдзі, пернікі і мыла ручной работы, дызайнерскія паштоўкі і роспіс па шкле — тут знойдзецца падарунак на любы густ. Пра гэта паведаміў «Звяздзе» ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі.

Для ахвотных арганізуюць майстар-класы, на якіх можна навучыцца распісваць пернік або зрабіць асаблівы падарунак з паперы сваімі рукамі. Каларытным дапаўненнем да афармлення прасторы выстаўкі стала экспазіцыя савецкай навагодняй паштоўкі 1950—1980-х гадоў з фондаў музея. На экспазіцыі арганізавана навагодняя фотазона.

Для стварэння непаўторнай утульнай атмасферы працуе кавярня «Цікава». Смачныя кава, травяныя чаі, какава, гарачы шакалад і, вядома ж, глінтвейн сагрэюць вас у любое надвор'е.

Выстаўка будзе працаваць да 10 студзеня 2021 года.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Слова — чытачам

# Чаму эколагі выбіраюць «Звязду»



**Андрэй ХУДЫК, міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:**

— Сярод пытанняў аховы навакольнага асяроддзя права грамадзян на атрыманне і распаўсюджванне дакладнай экалагічнай інфармацыі, на доступ да яе, займае ці не першае месца. Гэта абумоўлена тым, што наяўнасць актуальнай экалагічнай інфармацыі служыць каркасам актыўнасці грамадскіх аб'яднанняў і грамадзян, эфектыўнай дзейнасці дзяржаўнага кіравання ў галіне аховы навакольнага асяроддзя, якаснай ацэнкі ўплыву гаспадарчай дзейнасці на навакольнае асяроддзе і яе кампетэнтны аналіз.

Для эколагаў «Звязда» ўжо шмат гадоў з'яўляецца тым выданнем, журналісты якога заўсёды прыходзяць нам на дапамогу ў вырашэнні любой сітуацыі. Мы разам як у самых «гарачых кропках» парушэнняў прыродаахоўнага заканадаўства, так і ў здзяйсненні добрых экалагічных спраў і акцый. Тэма аховы прыроды, правы грамадзян на здаровае навакольнае асяроддзе падаюцца газетай бесстаронне, аператыўна і ніколі не сыходзяць у цень іншых пытанняў.

Адкрываючы новы нумар газеты, чытач заўсёды можа быць упэўнены, што адным з першых даведаецца пра свежыя экалагічныя падзеі краіны.

Надвор'е

# Спачатку мокрая «Грэта», а потым і злёгку падмарозіць

## Але ўсё роўна тэмпературны фон будзе павышаны

**Так, пакуль у нас зіма на двары праяўляе свой характар з пераменным поспехам. У першай палове тыдня надвор'е ў краіне будзе знаходзіцца ва ўладзе атмасферных франтоў, якія перамяшчаюцца з боку Заходняй Еўропы. Таму на большай частцы нашай тэрыторыі чакаюцца ападкі рознай інтэнсіўнасці ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Паўсюдна захаваецца галалёд, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння ўдзень месцамі пройдуць невялікія і кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах чакаюцца слабыя туман і галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра — ад 3 марозу да 3 цяпла. Таксама амаль «ніякае» чакаецца надвор'е ў сераду: часам пройдуць ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Месцамі па краіне будзе слабы галалёд, на дарогах — галалёдзіца, па ўсходзе краіны чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—18 м/с. Уначы прагназуецца ад нуля да 6 марозу, удзень — ад мінус 2 градусаў да 4 цяпла. У паўднёва-заходніх раёнах краіны будзе значна цяплей: уначы 1—3 градусы вышэй за нуль, удзень — 5—6 цяпла.

У далейшым (чацвер і пятніца) праз тэрыторыю Беларусі будзе перамяшчацца цыклон «Грэта», які цяпер набірае сілы над Брытанскімі астравамі. Ён прынясе ўжо ва ўсе раёны краіны больш інтэнсіўныя ападкі ў выглядзе мокрага снегу, а па поўдні краіны — снегу з дажджом.

У чацвер уначы выключна месцамі, а раніцай і ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах чакаецца слабы галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 3 марозу да 4 цяпла, удзень — ад мінус 1 градуса да плюс 6. У пятніцу «Грэта» будзе ўжо слабець, таму на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца толькі кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу, па паўднёвай палове з дажджом, на дарогах месцамі будзе галалёдзіца. Тэмпература на працягу сутак складзе ад мінус 3 градусаў да 4 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у суботу цыклон працягне рухацца далей на Маскоўскую вобласць. У яго тылавой частцы ў нашу краіну пачне паступаць больш халоднае паветра паўночных шырот. Вось тады і панізіцца тэмпературны фон. Праўда, не нашмат.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Мікалай ШАРСНЁЎ:

# «Усё дзеля паляпшэння

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Я часта бываю ў родных мясцінах, дзе да гэтага часу памятаю ўсе палі і сцяжынкі, сустракаюся з аднакласнікамі, аднавяскоўцамі. Гэтыя сустрэчы вельмі дарагія майму сэрцу. Яны падымаюць настрой, бударажаць успаміны пра дзяцінства, маладыя гады... Малая радзіма для мяне — гэта ўнутраны стрыжань, аснова жыцця, пачатак пачаткаў. Гэта памяць аб бацькавай хаце, пра сям'ю, гэта душа маёй вялікай Радзімы — Беларусі.

Аб'яўленне Года малой радзімы падштурхнула больш пільна прыглядзецца да праблем маленькіх вёсак, невялікіх пасёлкаў, іх добраўпарадкавання. Упэўнены, сапраўдная любоў да радзімы пачынаецца з клопату пра яе...

Пра «перазагрузку» майго роднага Аршанскага раёна, якая ажыццяўляецца згодна з адпаведным прэзідэнцкім указам, СМІ пішуць пастаянна. Галоўнае, што тутэйшыя адчулі: клопат аб паляпшэнні якасці іх жыцця — не толькі на паперы. І на гэты раён раўняюцца астатнія, адпаведны вопыт пераймаюць. Сярод іншага, шмат чаго зроблена для забеспячэння камфортных умоў жыцця ў глыбінцы.

Так, летась быў рэалізаваны пілотны праект па ўкараненні ўдасканаленай сістэмы дзяржаўных сацыяльных стандартаў па абслугоўванні насельніцтва. У цяперашні час па выніках рэалізацыі праекта і вывучэння грамадскай думкі вядзецца работа па карэкціроўцы сістэмы для ўсёй краіны.

Акрамя таго, у Аршанскім раёне паспяхова праведзены эксперымент па стварэнні альтэрнатывы спажывецкай кааперацыі: у 2018 годзе кампаніі «Еўрагандаль» былі перададзены гандлёвая сетка фінансава няўстойлівага раённага спажывецкага таварыства і маршруты аўтакрам для абслугоўвання 219 маланаселеных пунктаў.

На сённяшні дзень на сельскай тэрыторыі працуюць 38 крам і шэсць аўтакрам сеткавага аператара. Вяскоўцы станоўча ацанілі змены, якія адбыліся.

***— Адна з ключавых задач, агучаных Прэзідэнтам, калі ён аб'яўляў Год малой радзімы, — навядзенне парадку на зямлі, добраўпарадкаванне населеных пунктаў, павышэнне якасці жыцця людзей. Безумоўна, гэта ўсё было ў цэнтры ўвагі ўлады розных узроўняў і раней. Што паспелі зрабіць у рэгіёне?***

— Штогод мы маштабна трансфармуем райцэнтры, якія прымаюць эстафету свята працаўнікоў вёскі «Дажынкі», што дазваляе ім набыць новае сучаснае аблічча. Паралельна ўладкоўваем па два пасёлкі вобласці, раўняючыся на аграгарадок Копысь Аршанскага раёна, дзе, бадай, правялі самыя маштабныя работы.

Шмат чаго зрабілі ў пасёлках розных раёнаў: Балбасава, Езярышча, Бягомль, Багушэўск, Відзы, Обаль. Гэтыя населеныя пункты не павінны быць тэрыторыямі кантрастаў. Галоўнае, навесці парадак ва ўсім: ад прыдамавых участкаў да цэнтральных вуліц. Гэта работа датычыцца не толькі мясцовай улады. Самі жыхары не павінны заставацца ўбаку ў справе па падтрыманні парадку. Іх намаганні — для сябе, падрастаючага пакалення, каб кожнаму стала прыемней жыць, працаваць і адпачываць.

Цяжка пералічыць усе мерапрыемствы, прысвечаныя Году малой радзімы. Нават калі коратка напісаць пра кожнае, думаю, не хопіць для гэтага нумара газеты.

***— Вы згадалі «Дажынкі». Ці маглі б коратка распавесці пра святы нашых кармільцаў за апошнія тры гады?***

— «Дажынкі-2018» адбыліся ў Верхнядзвінску. Падчас падрыхтоўкі да фестывалю стварылі выразнае аблічча райцэнтра. Дзякуючы пераўтварэнням ён набыў рысы сучаснага горада. Больш за дзвесце аб'ектаў атрымалі другое нараджэнне. У тым ліку будынкі цэнтральнай раённай бібліятэкі, дзіцячай школы мастацтваў.

Своеасаблівым рэсурсным цэнтрам для прасоўвання інавацый у адукацыі раёна стала сярэдняя школа № 2, якая адчыніла свае дзверы пасля капітальнага рамонту напярэдадні Дня ведаў. Тады быў адкрыты новы фізкультурна-аздараўленчы комплекс «Імпульс» з басейнам, дзвюма саўнамі, трэнажорнай і залай для фітнесу, мадэрнізаваны будынак цэнтра культуры і народнай творчасці. Падарункам для жыхароў райцэнтра стаў 12-кватэрны жылы дом, пабудаваны ў рэкордныя тэрміны — усяго за чатыры з паловай месяцы.

Новае аблічча атрымалі цэнтральная плошча Юбілейная, гарадскі сквер, набярэжная Заходняй Дзвіны, з'явіўся фантан.

«Дажынкі-2019» прайшлі ў Браславе. Больш за сто аб'ектаў атрымалі адраджэнне. У гэтым спісе СШ № 2, якая стала лепшай па ўмовах. Тут з'явіліся залы рытмікі і адзінаборстваў. Па-новаму аснашчаны лінгафонны і камп'ютарны класы. На прылеглай тэрыторыі абсталяваны пляцоўкі з вулічнымі трэнажорамі, для гульні ў валейбол і баскетбол. Стварылі і аўтамабільны гарадок для навучання правілам дарожнага руху.

Пасля капітальнага рамонту кардынальна змяніў свой знешні выгляд дзіцячы садок № 3, у якім з'явіліся новая мэбля, гульнявое, надворнае абсталяванне.

Мадэрнізавалі гарадскі стадыён, дзе цалкам заменены хакейная каробка, футбольнае поле, адрамантаваны трыбуны для гледачоў, з'явіліся бегавыя дарожкі з сучасным пакрыццём.

У цэнтральнай раённай бальніцы праведзены рамонт хірургічнага аддзялення, прыёмнага пакою, паліклінікі, а таксама стаматалагічнага аддзялення, для якога закуплена спецыяльнае абсталяванне.

У ліку ключавых аб'ектаў, дзе выкананы комплекс рамонтных работ: дзіцячаюнацкая спартыўная школа, тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, раённы цэнтр культуры, цэнтральная раённая бібліятэка, школа мастацтваў.

Пасля маштабнай мадэрнізацыі новы выгляд мае прыбярэжная паласа возера Дрывяты. Добраўпарадкавана месца правядзення асноўных урачыстасцяў — лесапарк «Леснічоўка»...

***— Безумоўна, сёлетнія віцебскія «Дажынкі» па масавасці і маштабнасці сталі рэкорднымі, напэўна, ва ўсёй краіне. Абласны цэнтр рыхтаваў да свята, як пакалася многім старажылам, нават больш грунтоўна, чым да чарговага «Славянскага базару», які, дарэчы, у наступным годзе праведзём у трыццаты раз.***

— Так, «Дажынкі-2020» сталі святам вельмі маштабным. Напрыклад, у іх бралі ўдзел больш за шэсць тысяч работнікаў аграпрамысловага комплексу. Цырымонія ўзнагароджання пераможцаў адбылася ў адной з самых вялікіх пляцовак — у Летнім амфітэатры.

У Віцебску падчас падрыхтоўкі да фоpуму звыш ста аб'ектаў адрамантавалі, зрабілі больш утульнымі, каб яны адпавядалі патрэбам часу. З'явіліся і новыя. Вялікая ўвага аддавалася сацыяльнай сферы. Напрыклад, мадэрнізавалі другі корпус абласнога Палаца дзяцей і моладзі. Адкрылі дзіцячую амбулаторыю ў спальным мікраpаёне Білева, сучасны спартыўны комплекс Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава, спартыўныя пляцоўкі. Усталявалі вулічныя трэнажоры для шэрагу іншых устаноў адукацыі. На карце Віцебска з'явіўся і трэніравальны манеж, які атрымала дзіцяча-юнацкая школа футбольнага клуба «Віцебск».

Няма аналагаў у вобласці новай сярэдняй школе № 47 імя генерала Іваноўскага, абсталяванай па апошнім слове тэхнікі.

Правялі абнаўленне фасадаў жылых дамоў і адміністрацыйных будынкаў.

На вуліцах з'явіліся новыя малыя архітэктурныя формы. Кардынальна змянілі свой знешні выгляд плошча Свабоды, сквер на вуліцы Кірава, парк Тысячагоддзя...

Сапраўдны падарунак для жыхароў 40-тысячнага маладога мікрараёна Білева і ўсяго абласнога цэнтра — адкрыццё аўтадарогі, якая стала працягам праспекта Будаўнікоў (на ўчастку ад вуліцы Броўкі да Караткевіча). Разам з магістраллю быў уведзены ў эксплуатацыю падземны пешаходны пераход. Пасля маштабнай рэканструкцыі адкрыта адна з найважнейшых транспартных артэрый Віцебска — пуцепровад «Полацкі». Гэтая сучасная дарожная развязка стала сапраўдным упрыгажэннем паўночнай сталіцы Беларусі.

***— Нагадайце, калі ласка, пра тое, што было зроблена ў час падрыхтоўкі да «Дажынак» у Віцебскім раёне.***

— Лічу, што вельмі дастойна выглядае і гэтая «агранка» абласнога цэнтра. Новыя сучасныя рысы набыў аграгарадок Ноўка. Тут добраўпарадкавалі ўнутрыдваровыя тэрыторыі, пасля капітальнага рамонту змяніліся да лепшага шматкватэрныя жылыя дамы, устаноўлены новыя гульнявыя комплексы для дзяцей. Па-сучаснаму абсталявалі школу, дзіцячы садок.

У ліку ключавых аб'ектаў, дзе выкананы комплекс рамонтных работ, будынкі Ноўкінскага сельскага выканкама, пошты, мясцовага ФАПа, аўтастанцыі ў Мядзвёдцы і Сасноўцы. Прыкметна палепшылася якасць дарог.

У пасёлку Тулава ўведзены 60-кватэрны дом з электраацяпленнем. Новыя спартыўныя комплексы з'явіліся ў пасёлках Кіраўскі, Акцябрскі, Альгова. Пабудавана станцыя абезжалезвання ў вёсцы Буяны.

Узведзены і новыя сучасныя аграпрамысловыя аб'екты. Віцебская бройлерная птушкафабрыка ў Курыне «прырасла» зернеачышчальна-сушыльным комплексам (магутнасць 140 тон у гадзіну), элеватарам для захоўвання збожжа (на 30 тысяч тон) і рапсу (на 6 тысяч тон), лініяй па перапрацоўцы алейных культур, зернеачышчальна-сушыльным комплексам «Янавічы» (магутнасць 90 тон у гадзіну), элеватарам для захоўвання збожжа (на 15 тысяч тон), а таксама новымі і рэканструяванымі малочнатаварнымі фермай і комплексам.

Сельгаспрадпрыемства «Мазалавагаз» адкрыла завод па перапрацоўцы алейных культур.

Дарэчы, у Віцебскім раёне толькі за апошні год пабудаваны і рэканструяваны дваццаць жывёлагадоўчых аб'ектаў.

Пасля заканчэння фестываляў аграрыяў абнаўленне райцэнтраў працягваецца. Усё

У нядзелю на Віцебшчыну з Мінска адправіліся вялізныя калоны сучаснай тэхнікі. 240 трактароў BELARUS МТЗ адправіў да месца прызначэння сваім ходам. Зрабіць перадачу трактароў урачыстай — сумеснае рашэнне МТЗ і Віцебскага аблвыканкама. Тым больш што адной з умоў пастаўкі ў кантрактах прапісаны самавываз. Дзень тыдня быў абраны з улікам мінімальнай загрузкі на рэспубліканскіх трасах. Для руху калон, якія накіраваліся ў розныя раёны вобласці ў складзе некалькіх дзясяткаў адзінак тэхнікі, патрэбныя пэўныя ўмовы.





Фота БелТА.

**Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСНЁЎ дзякуе генеральнаму дырэктару ААТ «МТЗ» Віталю ВОЎКУ за патрэбную вобласці тэхніку.**

Усяго кантрактамі прадугледжана пастаўка 354 адзінак тэхнікі, у тым ліку 70 энерганасычаных трактароў, на агульную суму Br42,8 млн. Машыны адправяцца ў амаль 40 аграпрамысловых арганізацый вобласці, у тым ліку на Глыбоцкі малочнакансервавы камбінат, Верхнядзвінскі МСЗ, Пастаўскі малочны завод, Полацкі малочны камбінат, Віцебскі мясакамбінат і Аршанскі мясакансервавы камбінат. Працаваць на іх будуць маладыя механізатары. Трактары, што засталіся пасля масавай адгрузкі, плануюць даставіць у Віцебскую вобласць да канца снежня.

# жыцця людзей!»

застаецца людзям на гады. І гэта той шлях, які адкрывае перспектыву, у тым ліку і для сельскай моладзі. Калі людзі будуць мець у роднай вёсцы жыллё, аб'екты сацыяльнай сферы, месцы для адпачынку — тады вёска ажыве. Але разам з тым важныя і ўмовы для працы з прывязкай да трывалай вытворчай базы і добрай зарплатай.

***— Як кажуць, на слыху рэформы, якія праводзяцца ў сельскагаспадарчай галіне на Віцебшчыне.***

— У рэгіёне дзейнічаюць сем аграпрамысловых аб'яднанняў, створаных па Указе Прэзідэнта ад 25 лютага 2020 года № 70 «Аб развіцці аграпрамысловага комплексу Віцебскай вобласці». Новыя аграпрамысловыя аб'яднанні закліканыя зрабіць, можна сказаць, рэвалюцыю ў аграрнай эканоміцы рэгіёна, што вельмі радуе.

Ёсць, на мой погляд, у іх і яшчэ больш важная задача: яны створаны для вяскоўцаў і павінны прынесці карысць непасрэдна ім — сапраўдным гаспадарам на зямлі.

Рэфармаванне АПК, да якога мы ішлі планамерна і паэтапна, накіравана на павышэнне ўзроўню сельскагаспадарчай вытворчасці. Гэта звязана і з ростам заработнай платы ў вяскоўцаў, а значыць, і з павышэннем іх прафесійнага ўзроўню, замацаваннем кадраў у вёсцы.

Несумненна, на станоўчую матывацыю да прафесіі ўплывае дзеючая ў нашым рэгіёне прывабная сістэма матэрыяльнага стымулявання. Два гады таму карэкціроўцы ў бок павелічэння падвяргаліся зарплаты механізатараў, спецыялістаў жывёлагадоўчай галіны. Прафесіяналы сваёй справы пры зацікаўленасці ў канчатковым выніку і павелічэнні паказчыкаў, улічваючы ўсе надбаўкі, могуць зарабіць ад дзвюх тысяч беларускіх рублёў і больш. Там, дзе дастойная зарплата, мяркую, цяжкасцяў з кадрамі не ўзнікае. Дарэчы, разрыў сярэднямесячнай зарплаты на вёсцы ў параўнанні з прамысловасцю скараціўся практычна на пяць працэнтаў.

Яшчэ адзін сур'ёзны вектар, які ўплывае на імідж галіны — падрыхтоўка кадраў. Сёння мы робім стаўку на выхаванне работніка вытворчасці. Ён павінен прыйсці на сваё рабочае месца падрыхтаваным, матываваным спецыялістам. Фарміраванне ўяўлення аб сельскім укладзе жыцця і вытворчасці закладваецца ўжо са школы — на гэта і накіраваны створаныя ў вобласці аграрныя класы. Умацаваць дадзеныя пазіцыі закліканы профільныя сярэднеспецыяльныя і вышэйшыя навучальныя ўстановы, дзе ў два разы павялічылі працягласць вытворчай практыкі. У якасці базы — толькі перадавыя гаспадаркі, абсталяваныя сучаснай тэхнікай. Сярод бонусаў, што прадугледжаны выпускнікам, — прадастаўленне адтэрміноўкі ад прызыву ў войска, замена тэрміновай службы ў войску на службу ў рэзерве, аказанне грашовай дапамогі на абзавядзенне гаспадаркай. І плюс — стымулюючыя надбаўкі да заробку, забеспячэнне добраўпарадкаваным жыллём альбо кампенсацыя расходаў па яго найме. Віцебшчына імкнецца стварыць максімальна прывабныя ўмовы для маладых спецыялістаў. У сувязі з гэтым штогод у вобласці павялічваецца працэнт іх прыбыцця і замацавання.

***— Быў час, калі на Віцебшчыне было нямала даўгабудаў. Памятаю, у прыватнасці, ніяк не маглі дабудаваць на сёння шэсць «зорны» атэль Віцебска — «Лучосу». Як цяпер: ёсць праблемныя будоўлі?***

— Толькі за апошніх некалькі гадоў у рэгіёне ўведзены ў эксплуатацыю шэраг аб'ектаў, уключаючы і даўгабуды. Прывяду толькі некалькі прыкладаў. Будаўніцтва раённай бальніцы ў Мёрах пачалося ў 1992 годзе, у далейшым, як кажуць будаўнікі, аб'ект быў «замарожаны», а здадзены пад ключ праз 26 гадоў — у 2018-м.

Паліклініка ў віцебскім мікрараёне «Поўдзень-7» уведзена праз дзевяць гадоў — у 2019-м, тэрапеўтычны корпус Аршанскай гарадской бальніцы № 1 імя Сямашкі будаваўся амаль сем гадоў.

Дарэчы, пра ахову здароўя: на фінансаванне гэтай сферы расходуецца чвэрць бюджэту вобласці.

За пяцігодку ўведзены ў эксплуатацыю больш за сто аб'ектаў. Гэта паліклінікі ў Верхнядзвінску, Новалукомлі, Чашніках, Расонах, Ушачах, Сянне, Бягомльская і Балбасаўская ўчастковыя бальніцы, інфекцыйны корпус у Глыбокім, стаматалагічныя аддзяленні ў Браславе і Докшыцах.

Сёлета завершана: мадэрнізацыя лячэбнага корпуса абласнога шпіталя інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны «Юрцава», капітальна адрамантавана аддзяленне рэабілітацыі гарадской бальніцы № 3 Аршанскай цэнтральнай паліклінікі.

На асаблівым кантролі — паляпшэнне якасці пітной вады. У гэтых мэтах у вобласці працягваецца будаўніцтва 80 станцый абезжалезвання для 30 тысяч жыхароў сельскіх населеных пунктаў.

Вельмі многае робіцца і для паляпшэння экалагічнай абстаноўкі, каб панізіць да мінімальнага ўзроўню магчымыя страты здароўя людзей ад навакольнага асяроддзя. У прыватнасці, запланавана стварэнне шасці аб'ектаў, дзе па сучасных тэхналогіях будуць захоўваць і сартаваць цвёрдыя камунальныя адходы. Яны з'явяцца ў Віцебскім, Аршанскім, Полацкім, Глыбоцкім, Мёрскім, Чашніцкім раёнах.

У цяперашні час завяршаюцца работы па будаўніцтве смеццесартавальнага завода для Віцебска.

***— Многае робіцца і для сістэмы атрымання ведаў. Калі ласка, распавядзіце крыху пра гэта.***

— Аснова паспяховай будучыні — адукацыя, якая па-ранейшаму з'яўляецца прыярытэтам для фінансавання. На яе развіццё штогод накіроўваецца трэцяя частка бюджэту вобласці. І што вельмі важна — не толькі ў Віцебску ствараюцца сучасныя ўмовы для навучання, адкрываюцца новыя дзіцячыя садкі, школы, дзіцячыя дамы сямейнага тыпу.

За апошнія гады праведзены капітальныя і бягучыя рамонты ва ўстановах дашкольнай адукацыі: у Браславе, Докшыцах, Талачыне, Ушачах, Лёзне. Пабудаваны новыя — у Віцебску, Глыбокім, Оршы, Наваполацку.

У Талачынскім, Дубровенскім, Верхнядзвінскім, Браслаўскім раёнах рэалізаваны праект «Школа будучыні», які дазволіў па-сучаснаму перааснасціць гэтыя ўстановы.

За тры апошнія гады правялі рэканструкцыю будынкаў Віцебскага абласнога палаца дзяцей і моладзі. Там створаны адукацыйны цэнтр «Пазітрон», дзе дзеці ствараюць камп'ютарныя 3D-мадэлі таго, што існуе ў рэальнасці, з выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій самага высокага ўзроўню. І такія «лабараторыі» адкрыліся ў буйных гарадах вобласці. Усё гэта дазволіла стварыць сучасныя камфортныя ўмовы для развіцця творчых і інтэлектуальных здольнасцяў.

Канешне, ва ўстановах адукацыі шмат цікавага адбылося падчас трылогіі Года малой радзімы. Напрыклад, сумесна з абласной арганізацыяй «Белая Русь» правялі конкурсы «Спадчына малой радзімы. Віцебшчына ў мініяцюры». З энтузіязмам школьнікі бралі ўдзел у конкурсе «Герб маёй малой радзімы».

У Полацкім раёне з вялікім поспехам рэалізуецца гісторыка-адукацыйны праект «Стужка часу». Дзеці сталі не толькі даследчыкамі, але і экскурсаводамі, мадэльерамі, акцёрамі. А маленькія і юныя жыхары вёскі Зубрэвічы Аршанскага раёна летась бралі ўдзел у стварэнні дакументальнага фільма пра класіка беларускай літаратуры «Нататкі на палях» тэлеканала «Беларусь 3». У Віцебскім раёне вельмі зацікавіў тутэйшых «Музейны дыліжанс на колах часу». Наогул, цікавых прыкладаў творчасці і крэатыўнасці вельмі шмат.

***— І, вядома, заўсёды ў прыярытэце будуць фізкультура і спорт.***

— Безумоўна. Што датычыцца гэтага кірунку, за пяць гадоў уведзены ў эксплуатацыю дзесяць крытых сучасных спартыўных комплексаў, пяць плавальных басейнаў, тры футбольныя палі, сучасная лыжаролерная траса, дзесяць шматпрофільных спартыўных пляцовак са штучным пакрыццём і шэраг іншых аб'ектаў.

Спартсменамі вобласці за перыяд з 2016-га да 2020 года на афіцыйных міжнародных спаборніцтвах заваявана 574 медалі. У тым ліку па алімпійскіх відах спорту 209, з іх залатых — 78, сярэбраных — 76 і бронзавых — 55.

Па выніках выступлення на II Еўрапейскіх гульнях — 2019 у Мінску было заваявана шэсць залатых медалёў (веласпорт, лёгкая атлетыка, скачкі на батуце, самба).

На матчавай сустрэчы спартсменаў Еўропы і ЗША па лёгкай атлетыцы, якая адбылася летась таксама ў сталіцы нашай краіны, у спартсменаў з Віцебшчыны — «золата» (Максім Недасекаў перамог у скачках у вышыню).

Асноўным паказчыкам у спорце найвышэйшых дасягненняў з'яўляецца выступленне на Алімпійскіх гульнях.

Разам з дасягнутымі вынікамі ў спорце найвышэйшых дасягненняў павышаецца цікавасць насельніцтва да здаровага і актыўнага спосабу жыцця, пра што сведчыць штогадовае павелічэнне працэнта тых, хто займаецца фізічнай культурай і спортам, да агульнай колькасці жыхароў. На сёння такіх каля 25,4 %, і ў параўнанні з 2016 годам гэты паказчык павялічыўся на 49,6 тысячы чалавек

***— Наколькі паспяхова функцыянуе прамысловасць Віцебшчыны?***

— Развіццё сацыяльнай сферы знаходзіцца ў прамой залежнасці ад работы рэальнага сектара эканомікі. Віцебшчына стабільна забяспечвае 15 % аб'ёму прамысловай вытворчасці краіны. За пяць гадоў у галіне праведзены тэхнічнае пераўзбраенне і мадэрнізацыя шэрагу прадпрыемстваў.

Пабудаваны Віцебская і Полацкая ГЭС. Праведзена рэканструкцыя ўстановак гідраачысткі і вытворчасці вадароду на «Нафтане». Завершана мадэрнізацыя Аршанскага льнокамбіната і Віцебскага футравага камбіната.

У гарадскім пасёлку Балбасава Аршанскага раёна ўведзены ў эксплуатацыю першы пускавы комплекс мультымадальнага прамыслова-лагістычнага цэнтра «Брэміна-Орша».

У дзень святкавання гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі з удзелам кіраўніка беларускага ўрада Рамана Галоўчанкі на Мёрскім металапракатным заводзе правялі цырымонію запуску вытворчасці халоднакатанага ліста. На ўсёй еўразійскай прасторы аналагічных заводаў адзінкі. Плануемы выхад на праектную магутнасць прадпрыемства — трэці квартал 2021 года. На першым этапе мяркуецца вытворчасць 150 000 тон белай бляхі ў год. А пасля пуску другой чаргі завода прадукцыйнасць павялічыцца да 240 000 тон у год.

Трэць выпушчанай прамысловай прадукцыі — інавацыйная. Тавары, выробленыя ў вобласці, экспартуюцца сёння больш чым у семдзесят краін свету.

І гэта толькі невялікая частка праведзенай работы ў прамысловасці за бягучую пяцігодку.

Прыярытэтнай задачай мясцовай улады па-ранейшаму з'яўляецца павышэнне ўзроўню якасці жыцця насельніцтва. Дзеля гэтага мадэрнізуецца вытворчасць і адкрываюцца новыя аб'екты, у тым ліку з прыцягненнем замежных інвестараў; аказваецца падтрымка прыватнай дзелавой ініцыятыве.

Упэўнены, што вобласць яшчэ не раскрыла ўвесь свой эканамічны, прамысловы, інтэлектуальны, творчы і іншы патэнцыял. Гонар паўночнага рэгіёна — працавітыя, разумныя людзі, патрыёты з вялікай літары, якія здзейсняць яшчэ шмат карыснага для любімага краю і краіны ў цэлым і перададуць гэты здабытак і працоўныя навыкі сваім дзецям і ўнукам, каб тыя зрабілі Віцебшчыну яшчэ больш прывабнай і ўтульнай для жыцця.

Блізкая ўлада

# Ініцыятывы — вітаюцца

## Мікалай ШАРСНЁЎ у мінулую суботу падчас прамой тэлефоннай лініі за тры гадзіны выслухаў дваццаць чалавек

Кранула просьба жыхаркі абласнога цэнтра дапамагчы прайсці рэнтген-даследаванне, якое неабходна з-за бясплоднасці. З кастрычніка яна ў чарзе. Але з-за пандэміі гараджанка атрымаць медыцынскую паслугу пакуль не можа. Старшыня аблвыканкама адрасу даручыў кіраўніку галоўнага ўпраўлення па ахове здароўя, які прысутнічаў у кабінеце, зрабіць выключэнне. Калі спатрэбіцца, жанчыне могуць прапанаваць неабходнае нават у Мінску. Трэба падтрымаць жанчыну, якая вельмі хоча стаць мамай!

Пасля званка (таксама з Віцебска) наконт жыллёва-камунальнай праблемы губернатар патрабаваў правесці службовае расследаванне. Мужчына з дома на вуліцы Воінаў-інтэрнацыяналістаў паведаміў, што тры тыдні з-за прарыву сістэмы каналізацыі ў пад'ездзе адчуваецца непрыемны пах.

А палачанка распавяла пра кватэру, якая ўжо больш за два месяцы таму пацярпела з-за цечы даху. Жыллё з-за ападкаў залівае, а камунальнікі не спяшаюцца выправіць становішча. У іх свой погляд на праблему: каб адрамантаваць каля 35 квадратных метраў даху, неабходна правесці тэндар. Але ж па-чалавечы: хацелі б яны столькі чакаць і назіраць, як жыллё прыходзіць у непрыдатнасць?

З Оршы з аднаго дома выйшлі на сувязь з губернатарам двое жыхароў. Абодва паскардзіліся, што ў новым «разумным доме» холадна ў кватэрах. І вада не гарачая, а «цёпленькая». У райвыканкаме ў курсе праблемы, там паабяцалі зрабіць усё, каб выправіць недахопы.

А дзякуючы званку жыхара пасёлка Светлы Віцебскага раёна будзе прааналізавана актуальная для ўсёй краіны тэма: магчымасці пераводу шматкватэрнага жылля на электрычнае ацяпленне. Мужчына расказаў, што мае печку. Ён спытаў: ці магчыма зрабіць падагрэў электрычным? Для гэтага неабходны новы «ўводны» кабель на ўвесь дом, у якім восем кватэр. Зразумела, аднаму аплаціць усё не па кішэні. Ды і не ўсе суседзі за перамены. Пакуль губернатар высвятляў нюансы, спецыялісты растлумачылі: на Віцебшчыне ў найбліжэйшай перспектыве запланавана перавесці на электрычнае забеспячэнне 23 дамы... Беларуская АЭС і была пабудавана, каб панізіць выдаткі пры выпрацоўцы электраэнергіі, якую трэба актыўна выкарыстоўваць. І такія грамадзянскія ініцыятывы толькі вітаюцца.

Жыхарка вёскі Цітова Лёзненскага раёна не скардзілася на бюракратызм і няўважлівасць да яе асабіста і насельніцтва ў цэлым, наадварот, папрасіла неяк адзначыць прадстаўнікоў мясцовай прадстаўнічай улады. У прыватнасці, шмат цёплых слоў выказала ў адрас старшыні Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў Тамары Дрылёнак. Яна, як падкрэсліла заяўніца, вельмі працавітая, тактычная і праяўляе цярпенне ў адносінах з землякамі. Губернатар паабяцаў, што, канешне, будзе прынятае адпаведнае арганізацыйнае рашэнне.

Падводзячы вынікі размовы, Мікалай Шарснёў канстатаваў: у адрозненне ад многіх папярэдніх прамых ліній, пытанні прагучалі актуальныя. Па-ранейшаму праблема, якая найчасцей агучваецца, — дзейнасць ЖКГ. Пабачаў больш грунтоўна ўзяцца за выпраўленне недахопаў гэтай галіны. Туды на кіраўнічыя пасады трэба прызначаць нераўнадушных, прыстойных, разумных — тых, хто стараецца індывідуальна падысці да разгляду скаргі, выказаўся губернатар. І яны павінны падабраць каманду такіх жа адказных прафесіяналаў.

Па традыцыі некаторыя сігналы будуць на асабістым кантролі губернатара.

**Матэрыялы падрыхтаваў Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# 100 АДЦЕННЯЎ БЕЛАГА...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



А яшчэ Таццяна Аляксандраўна — мама! Яе дачка Паліна Лазарэвіч — студэнтка трэцяга курса лячэбнага факультэта Гомельскага медуніверсітэта. Такіх, як кажуць на вайсковым жаргоне, «салаг» у члены валанцёрскага атрада да гэтага часу не прымалі. Але дзяўчына даказала, што можа стаць надзейным партнёрам у агульнай камандзе.

Цяпер пяць дзён на тыдні студэнтка-трэцякурсніца (а гэты курс лічыцца самым складаным у «медзе») вучыцца ў Гомелі, а ў выхадныя заступае на «ковідную змену». Валанцёрства ў атрадзе, прынамсі, не залічваецца як вучэбная практыка і не аплачваецца. Проста дапамагаць тым, хто мае ў гэтым патрэбу, лічыць Паліна, для яе натуральнае імкненне душы. Карані спагады да людзей у генах. Лазарэвічы — сямейная дынастыя ўрачоў, вядомая ў Рэчыцкім раёне. Пасля заканчэння ВНУ дзяўчына пачне трэцяе пакаленне медыкаў.

— У мяне, як кажуць, не было шанцаў, — смяецца Паліна Лазарэвіч, калі тэлефаную ёй пасля заняткаў.

На «аватарцы» выкліку ў маім мабільным ўсплывае фота: вельмі прыгожая доўгавалосая дзяўчына, мадэль з вокладкі. Прынамсі, нават «супрацьчумка» ёй вельмі пасуе.

— Лазарэвіч — прозвішча майго дзеда Уладзіміра Уладзіміравіча, — тлумачыць Паліна. — Ён урач-хірург, больш як 25 гадоў узначальваў Рэчыцкую цэнтральную раённую бальніцу. Тата — Дзмітрый Уладзіміравіч Лазарэвіч — загадчык эндаскапічнага аддзялення ў Рэчыцкай ЦРБ. Маці — Таццяна Лазарэвіч — працуе з пацыентамі з каранавіруснай інфекцыяй яшчэ з першай хвалі. Цікава, што мая мама з Мазыра, а тата рэчыцкі. Яны пазнаёміліся на парах ва ўніверсітэце, куды зараз ужо хаджу я, часам да тых жа выкладчыкаў, — кажа студэнтка.

## Дзе нарадзіўся, там і згадзіўся

У рэчыцкім валанцёрскім атрадзе барацьбы з COVID-19, акрамя Паліны Лазарэвіч, трое дзяўчат-студэнтак шостага курса Гомельскага медуніверсітэта. Ёсць у іх валанцёрскай камандзе і мясцовы хлопец — сябар Паліны, таксама студэнт-медык, які вучыцца на другім курсе ўніверсітэта.

— Наша работа заключаецца не ў тым, каб выконваць абавязкі медсясцёр ці ўрачоў, мы не можам даваць кансультацыю ці назначаць лячэнне. Наша задача — інфармацыйная, асветніцкая, эмацыянальная падтрымка пацыентаў, — расказвае Паліна. — Тлумачым аб асаблівасці цячэння захворвання на каранавірус. Расказваем, чаму неабходна праводзіць рэабілітацыю. Вучым, як выконваць дыхальныя гімнастыкі, практыкаванні з ЛФК.



Валанцёр звяртае ўвагу, што на іх кантролі ў тым ліку захаванне пацыентам правільнага становішча цела на ложку. Гэта палягчае самаадчуванне і спрыяе хутчэйшаму выздараўленню.

— Вось, здавалася б, сёння багата паведамленняў у сеціве аб каранавірусе. Але калі мы даносім пацыентам неабходную інфармацыю, многія кажуць, што чуюць аб гэтым упершыню, бо раней звярталі ўвагу толькі на правілы гігіены і гігіенічнага рэжыму. Дарэчы, так адказваюць не толькі сталыя людзі, але і пацыенты маладога ўзросту, — адзначае студэнтка.

Яна распавядае, што ўвогуле валанцёры пільна сочаць за выкананнем рэкамендацый:

— Я неяк самастойна «адпрацоўвала» ў палаце, дзе ляжала пара сужэнцаў, а пасля, калі праходзіла міма па калідоры, заўважыла, што яны выконваюць усё, як я іх вучыла. Гэта сапраўды аблегчыла іх становішча.

Згадвае Паліна Лазарэвіч і свой першы самастойны выхад у «чырвоную» зону:

— Ты можаш падрыхтавацца інфармацыйна, але псіхалагічна размаўляць з пацыентам, сапраўды, — часам выклік для будучага ўрача, — кажа Паліна аб тым, як ёй, студэнтцы, напачатку бракавала ўпэўненасці ў сабе, сказвалася адсутнасць вопыту такіх стасункаў. — Я прыйшла ў палату, а там выключна пажылыя людзі і ўсе амаль нічога не чуюць. Спачатку разгубілася, але ўзяла сябе ў рукі, усё растлумачыла, спакойна паўтарала для кожнага паасобку, толькі вельмі гучна. Пасля перажывала за візіт.

Валанцёр расказвае, наколькі ўсе ў іх атрадзе радуюцца, калі пацыенты ідуць на кантакт:

— Ёсць тыя, хто задае шмат пытанняў. Ты распавядаеш, напрыклад, аб дыхальнай гімнастыцы, а яны табе: «А навошта?» Просяць растлумачыць падрабязней: як гэта ўплывае на працаванне хваробы, як будзе рэагаваць арганізм, што станецца, калі не праводзіць рэабілітацыю? З такімі людзьмі працаваць больш прыемна, бо ідзе дыялог.

Вядома, што інфармацыйная работа валанцёраў спрацоўвае і як сеанс псіхалагічнай разгрузкі для хворых. Пры тым, што шматлюдныя палаты не спрыяюць выхаду перажыванняў, нейкіх страхаў, але дасведчаны чалавек успрымае сваё лячэнне спакайней. Валанцёры дапамагаюць узброіцца ведамі, зразумець, што станоўчы эмацыянальны стан пацыента дапаможа ўрачам выйсці да паляпшэння стану здароўя.

— Складана працаваць не з пажылымі ці маладымі, а з тымі, хто «закрываецца», застаецца сам-насам з хваробай, — лічыць Паліна.

## Рэфлексія пад акампанемент цягніка...

Студэнт-валанцёр у добраахвотніцкім атрадзе правяла ўжо трое выхадных. Члены групы — студэнты шостага курса — ужо працуюць, але агульны графік для ўсіх выпрацаваць атрымалася. Цяпер «на змену» выходзяць раз на два тыдні. Патрэба ў валанцёрскай рабоце ёсць заўсёды. Задаю дзяўчыне традыцыйнае пытанне: што дае досвед валанцёра ў пандэмію?

— Я вам прызнаюся, што калі еду дадому на выхадныя ў цягніку, рыхтуюся маральна, асэнсоўваю для сябе тое, што дасць мне дзень сённяшні. Так, баюся, але не магчымасці заразіцца і перанесці каранавірус. Да гэтага, лічу, усе медыкі маральна гатовыя. Пакуль змагаюся са страхам «выступаць» перад пацыентамі, вучуся слухаць і чуць іх, своечасова супакоіць трапным адказам на іх пытанні. Бо ведаю ад свайго дзеда: дасведчанасць і кампетэнтнасць — галоўнае для ўрача. Ты не маеш права «заразіць» пацыентаў сваім хваляваннем. Такая работа мяне рыхтуе да таго, каб вырасці ў сапраўднага ўрача.

Паліна згадвае, чаму вучыць валанцёраў іх куратар Таццяна Лазарэвіч:

— Мама накіроўвае на тое, што наша работа дапамагае зняць у хворых панічны трывожны настрой. Важна ўпэўніць, што нават калі пашкоджана 75 % лёгкіх — гэта не прысуд. Гэта падстава для таго, каб жорстка прытрымлівацца ўказанняў урачоў, знайсці ў сабе сілы для барацьбы і змяніць сітуацыю на сваю карысць.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота Паліны ЛАЗАРЭВІЧ.**

• У тэму

## ДЫСТАНЦЫЯ І «ФІЛЬТР ЗДАРОЎЯ»

### Выкананне мер прафілактыкі каранавіруснай інфекцыі актыўна маніторацць на Гомельшчыне

**По інфармацыі Гомельскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, у рэгіёне праводзяцца штодзённыя праверкі выканання масачнага рэжыму ў грамадскіх месцах — на прадпрыемствах, рынках, гандлёвых цэнтрах, крамах, аптэках, грамадскім транспарце, кафэ. У рабоце задзейнічаны мабільныя групы, у складзе якіх прадстаўнікі органаў улады, спецыялісты санітарна-эпідэміялагічнай службы. На кантролі не толькі захаванне масачнага рэжыму, але і вытрымліванне сацыяльнай дыстанцыі, наяўнасць сродкаў дэзынфекцыі, правядзенне дэзапрацовак.**

— У лістападзе праведзены кантрольна-наглядныя мерапрыемствы ў дачыненні да 3795 аб'ектаў, парушэнні выяўлены на 1162 аб'ектах, — адзначыў **галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Гомельскай вобласці Сяргей БЕЛЫ.**

Так, на адным з аб'ектаў грамадскага харчавання ў Гомелі не праводзілася ва ўстаноўленым парадку вільготная прыборка з выкарыстаннем дэзсродкаў. У адной з крам аблспажыўтаварыства у Гомельскім раёне выкарыстоўваліся дэзсродкі без віруліцыдных уласцівасцяў, у фізкультурна-аздараўленчым комплексе ў Жлобіне работнікі не выкарыстоўвалі сродкі індывідуальнай аховы органаў дыхання, у адным з сельскіх клубаў Петрыкаўскага раёна не была нанесеная разметка для сацыяльнага дыстанцыявання наведвальнікаў, перад пачаткам работы ўстановы ў супрацоўнікаў не праводзіўся «фільтр здароўя».

— Дзяржсаннаглядам выдадзена 970 прадпісанняў і рэкамендацый па ліквідацыі выяўленых парушэнняў, вынесена 108 патрабаванняў аб прыпыненні (забароне) вытворчасці і (або) рэалізацыі тавараў (работ, паслуг). Да адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне мер прафілактыкі прыцягнута 77 службовых асоб, — удакладніў галоўны дзяржаўны санітарны ўрач вобласці.

# «Спадарожнік V» зарэгістраваны, вакцынаваць пачнуць у студзені

### На першым этапе ад COVID-19 прышчэпкі атрымаюць медыкі, настаўнікі і работнікі гандлю

**У Беларусі выдадзена рэгістрацыйнае пасведчанне на расійскую вакцыну «Спадарожнік V», а вакцынацыя беларусаў пачнецца ўжо ў студзені будучага года. Пра гэта расказаў міністр аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ.**

Міністэрства аховы здароўя Беларусі выдала рэгістрацыйнае пасведчанне на вакцыну «Спадарожнік V». Вакцына распрацавана і выраблена Нацыянальным даследчым цэнтрам эпідэміялогіі і мікрабіялогіі імя М. Ф. Гамалеі Расіі.

Як адзначыў Дзмітрый Піневіч, па дамоўленасці двух прэзідэнтаў Беларусь стала першай краінай, якая прыняла ўдзел у клінічных выпрабаваннях вакцыны «Спадарожнік V».

— Мы можам афіцыйна заявіць, што па наяўных на сёння даных, вакцына бяспечная і эфектыўная, сур'ёзных або непрадбачаных пабочных эфектаў выяўлена не было, — сказаў ён.

Па выніках працэдуры дзяржаўнай рэгістрацыі Міністэрства аховы здароўя выдала рэгістрацыйнае пасведчанне, пасля чаго вакцына «Спадарожнік V» можа быць дапушчана да рэалізацыі і медыцынскага ўжывання на тэрыторыі Беларусі.

Рэгістрацыйнае дасье вакцыны «Спадарожнік V» («Гам-Кавід-Вак») было пададзена ў Цэнтр экспертыз і выпрабаванняў у ахове здароўя на працэдуру ўмоўнай дзяржаўнай рэгістрацыі ў лістападзе 2020 года. Для ўсебаковай ацэнкі матэрыялаў рэгістрацыйнага дасье была створана экспертная група, у якую разам з экспертамі Цэнтра экспертыз уключаны вядучыя інфекцыяністы краіны і супрацоўнікі рэспубліканскіх навукова-практычных цэнтраў. Былі прааналізаваны матэрыялы, якія датычацца даклінічнага вывучэння вакцыны. Устаноўлена, што вакцына «Спадарожнік V» прайшла ў поўным аб'ёме ўсе этапы даклінічных выпрабаванняў па эфектыўнасці і бяспецы.

— Вакцына зарэгістраваная ў краіне, дадзены дазвол на клінічнае прымяненне, — адзначыў Дзмітрый Піневіч. — Вакцына можа прымяняцца на тэрыторыі нашай краіны ўжо ў рамках не клінічных выпрабаванняў, а звычайнай работы. Цяпер на парадку дня пытанні далейшай пастаўкі.

Як адзначылі ў прэс-службе Міністэрства аховы здароўя, у клінічнае выпрабаванне вакцыны на тэрыторыі Беларусі былі ўключаны 100 удзельнікаў. Іх выпадковым чынам падзялілі на групы: першая атрымала вакцыну, а другая — плацэба. Вакцынацыя ўключала ўвядзенне двух кампанентаў вакцыны з інтэрвалам у 21 дзень. У добраахвотнікаў ацэньваецца фарміраванне гумаральнага (выпрацоўка антыцел) і клеткавага імуннага адказу на вакцынацыю.

У Беларусі па стане на 9 снежня ўсе 100 удзельнікаў даследавання трэцяй фазы атрымалі першы кампанент вакцыны, а другі кампанент — толькі 98, бо ў двух пацыентаў перад увядзеннем другой дозы падчас абавязковага тэсціравання была выяўлена каранавірусная інфекцыя.

— Другую прышчэпку атрымалі 98 чалавек, двое паміж першым і другім увядзеннем кантактавалі з заражаным чалавекам і перахварэлі, таму другая фаза прышчэпкі ім не была праведзена», — растлумачыў Дзмітрый Піневіч.

Назіранне за ўдзельнікамі даследавання будзе весціся на працягу 180 дзён (6 месяцаў), пасля чаго будзе падрыхтавана фінальная справаздача.

Разам з тым, як адзначылі ў прэс-службе, у вакцынаваных людзей выпрацоўваецца ўстойлівы і гумаральны, і клеткавы імунны адказ. Прынята рашэнне, што вакцынацыя беларусаў ад каранавіруса расійскай вакцынай «Спадарожнік V» пачнецца ў студзені.

На першым этапе вакцынаваць будуць медыкаў, настаўнікаў, работнікаў гандлю і іншых сфер, якія вымушаны кантактаваць з вялікай колькасцю людзей. Вакцыну яны атрымаюць бясплатна. Па словах міністра, на першым этапе плануецца вакцынаваць 200 тысяч чалавек з далейшым ахопам у два мільёны.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ГІРЛЯНДЫ, ШЧАЎКУНКІ, ПРЫСМАКІ, ДРЭВЫ...

## Што прапануе гандаль да зімовага свята

**Да самага чароўнага свята года застаецца зусім няшмат. Калі вы яшчэ не паспелі падрыхтавацца, для вас карэспандэнт «Звязды» прабеглася па розных гандлёвых пунктах сталіцы, каб ацаніць асартымент ёлак і цацак, а разам з тым даведацца аб запытах пакупнікоў.**

### ЗЛЯПІЦЬ СНЯГУРКУ СВАІМІ РУКАМІ

Зайшоўшы ў адзін з найбуйнейшых гандлёвых цэнтраў, адразу заталіа дыханне: усё зіхаціць. Адусюль відаць высокая ёлка з яркімі шарамі і рознакаляровымі агеньчыкамі. Да таго ж чутны калядныя песні, што, безумоўна, стварае патрэбную атмасферу. У адной з крамаў падарункаў наведвальнікаў дастаткова, хоць і будні дзень. Касір, заўважыўшы маю зацікаўленасць, вырашыла дапамагчы.

— У нас ёсць усё, што патрэбна для Новага года. Актыўна купляюць ёлкі, свечкі, гірлянды і іншае. Самае таннае ўпрыгажэнне каштуе рубель — гэта магніт з прадказаннямі, самае дарагое — снежны шар з быком за 120 рублёў. Папулярныя статуэткі шчаўкунка, якія каштуюць крыху больш за 10 рублёў, шкляныя навагоднія шары ручной работы — ад 7 да 23 рублёў за экзэмпляр, маленькія сувеніры, асабліва ў форме быка за 2-3 рублі, а таксама календары з сімволікай наступаючага года — ад 5 да 20 рублёў (яны, дарэчы, штогод добра прадаюцца). Сёлета многім вельмі спадабаліся спрэі з трафарэтамі, з дапамогай іх можна рабіць малюнкі на вокнах. А яшчэ тыя падарункі, якія трэба дарабіць самастойна: сшыць, зляпіць, звязаць і іншае. Напрыклад, набор для творчасці «Чароўны шар» можна набыць за 10—15 рублёў у залежнасці ад памеру, пластыкавы шар для дэкарыравання — за 3,19 рубля.

Набор ёлачных шароў з дваццаці штук каштуе тут 6,75 рубля, з дваццаці чатырох — 19,19 рубля, за сорак адзінак аддасце 24,4 рубля. Чатыры шкляныя шышкі абыдуцца ў 8 рублёў, а сэрцы — у 6,5. Свечкі розных пахаў і колераў каштуюць ад 3 да 5 рублёў, а вось гелевыя ў наборы з трох штук — крыху больш за 20 рублёў. Мішура — амаль за 3 рублі, а гірлянда — без малога 59. Галоўны атрыбут свята — ёлку — тут можна купіць ад 100 рублёў.



— Лічу, што ў першую чаргу трэба выбіраць нешта для душы, — кажа пакупніца Людміла. — Пры выбары навагодніх упрыгажэнняў аддаю перавагу толькі беларускім гандлёвым цэнтрам. Зайшла сюды, каб «быць у курсе», што нам прапануюць іншыя прадаўцы. Але для мяне відавочна: па якасці і асартыменце выйграе айчынная вытворчасць. Большасць ёлачных шарыкаў, якія выкарыстоўваю ў святочныя дні для дома цяпер, засталіся яшчэ з 50-х гадоў, але часам хочацца набыць нешта новенькае. А ёлку стаўлю штучную, бо так больш практычна: купіў прыгажуню, — і гадоў 15 можна не турбавацца.

### «АПЕЛЬСІН У ЦУКРЫ» І «ЗІМОВЫ ЛЕС»

Зазірнулі ў іншую краму падарункаў, дзе таксама вельмі адчуваецца надыходзячае свята. Хтосьці выбірае абрусы, хтосьці — цацкі.

— Чаго ў нас толькі няма! — паказвае навагодні асартымент загадчыца. — Сёлета шмат навінак: ад сувеніраў да посуду з навагоднімі арнаментамі. Асноўны вытворца — Кітай. Напрыклад, дэкаратыўны вянок абыдзецца ў 18,18 рубля (дыяметрам 44 сантыметры), чырвоная зорка (49 на 49 сантыметраў) — у 15,5 рубля, але ёсць і танней — за 10,75 (дыяметрам 37 сантыметраў). «Дожджык» у залежнасці ад колеру і даўжыні каштуе ад 2 да 6 рублёў. Навагодні фартух дыяметрам 60 на 65 сантыметраў — 20 рублёў. Абрус са стапрацэнтнай баваўны (149 на 220 сантыметраў) — ад 39 да 71 рубля, прыхоп-рукавіцы — ад 3 да 12 рублёў, вязаныя пледы — ад 23 да амаль 82 рублёў. Свечкі ад 7 да 11 рублёў за набор. Аромасашэ па 10 грамаў за 3,49 рубля, у іх, дарэчы, вельмі прыгожыя назвы: «Апельсін у цукры», «Зімовы лес», «Калядны



кірмаш». А што датычыцца ёлак, то бяруць рознага памеру, высокія нават у прыярытэце, часцей за ўсё — белага колеру. Па кошце дыяпазон даволі шырокі: ад 100 да 420 рублёў.

Шышкі, снегавікі, быкі, гномы... Праўда, найбольшым попытам карыстаюцца звычайныя шкляныя шары. Вытворцы прапануюць камплекты ў сінім, чырвоным, залатым, зялёным і іншых колерах. Напрыклад, за набор з дванаццаці штук аддасце амаль 5 рублёў, а за шаснаццаць — ад 6 да 12. Самыя запатрабаваныя тыя, што патанней. Вось і студэнтка Паліна зайшла ў краму паглядзець на сталічны навагодні асартымент, кажа, што купляць асабліва нічога не збіраецца, бо прывыкла рабіць гэта ў іншым месцы.

— Сама са Смалявічаў, таму набываю ўсё там, — і ехаць далёка нікуды не трэба, і па цане выгадна. Напрыклад, тыдзень таму купіла гірлянду за 7 рублёў, а тут у гандлёвых цэнтрах яна каштуе мінімум 20. Я студэнтка, таму пакуль няма вялікіх сродкаў на дарагія ўпрыгажэнні для дома. Але каб зрабіць свой куточак асаблівым, лічу, што трэба ўмець часам вылучыць час на пошук «самага-самага», бо з першага разу можа не атрымацца, і гэта нармальна. А таксама можна зрабіць нешта сваімі рукамі. Напрыклад, у мінулым годзе мы з мамай зрабілі вянок з яловых пухнатых галінак і вяроўкі: павесілі на яго шышкі, маленькія цацкі, нацэрлі паралон, быццам снег. Атрымалася вельмі прыгожа!

### 16 РУБЛЁЎ ЗА «БЫЧКА» І 4 — ЗА «ЦУКЕРКІ»

Штогод на навагоднім кірмашы ў адным са сталічных універмагаў робяць пакупкі тысячы мінчан і гасцей сталіцы. Знайсці святочнае дрэва і падарункі тут атрымаецца лёгка. Шэрагі зялёных прыгажунь сустракаюць наведвальнікаў на самым уваходзе. Прыкладна палова ёлак — айчыннай вытворчасці. Астатнія пераважна з Польшчы і Кітая. Кошт на іх залежыць ад памеру і якасці. Напрыклад, за польскую хвою на 1,2 метра аддасце без малога 79 рублёў, «сібірскую» той жа вытворчасці на 1,8 метра можна набыць за 225 рублёў, «цёмна-зялёную» на 1,95 метра — за 355,9 рубля, дрэва на 1,8 метра абыдзецца ў 837,9 рубля, на 2,2 метра — 691,9, на 2,5 — 359,9, а самая высокая на 3 метры каштуе амаль 800 рублёў (усе апошнія — Беларусь).



Прадавец-кансультант расказаў, што попыт зараз ёсць на ўсе прапанаваныя тавары.

— Больш за ўсё пытаюцца пра тыя ёлкі, што з сіліконавымі галінкамі. Самыя маленькія дрэвы звычайна набываюць людзі сталага ўзросту, бо іх лягчэй данесці. Сярэдняга памеру бяруць уладальнікі ўласных дамоў і тыя, хто жыве ў кватэры. Самыя высокія ў большасці купляюць прадпрыемствы і кампаніі. Што датычыцца іншых упрыгажэнняў, дык, напрыклад, агеньчыкі на ёлку бяруць часцей за ўсё ў цэнавым дыяпазоне ад 15 да 40 рублёў, яны адрозніваюцца колерам, формай, даўжынёй шнура, памерам, колькасцю святлодыёдаў, усе яны — з Кітая. Цацкі ў форме быка, статуэткі, скарбонкі — таксама топ продажу. Напрыклад, за керамічную скарбонку «Бычок» аддасце ад 16 да 23 рублёў у залежнасці ад памеру. Навагоднія наборы шарыкаў з шасці штук — ад 6 да 9,4 рубля, па дзевяць штук — ад 7 да 10 рублёў. Дэкаратыўная галінка — 4,5 рубля. Ёсць тавары са зніжкамі. Напрыклад, чатыры шкляныя «цукеркі» абыдуцца ў 4,14 рубля.



### ДЗЕД МАРОЗ ЦІ САНТА КЛАУС?

А што прапаноўваюць сталічныя гіпермаркеты? У адным з іх, што ў Серабранцы, навагоднія атрыбуты сабраны побач.

— Бяруць гірлянды, мішуру, цацкі, шары, агеньчыкі, сувеніры, свечкі. Зразумела ж, купляюць цукеркі, шампанскае, мандарыны, — кажа таваразнаўца. — Сёлета амаль увесь асартымент новы. Напрыклад, статуэтка «Шчаўкунок» каштуе без малога 200 рублёў, 15-сантыметровая свечка «Гном» — 8,99 рубля, сувенір «Санта» — 39,98, Дзед Мароз — 69,99, статуэтка быка — 5,89 рубля. Калядны вянок з белымі кончыкамі і шышкамі — за амаль 50 рублёў, з ягадамі — за 54,99 рубля. «Дожджык» можна набыць па кошце ад рубля і вышэй, наборы ёлачных шароў — ад 7 рублёў за тры штукі да 70 рублёў за 94 адзінкі. Свечкі ёсць як за 6 рублёў, так і за 12. Посуд са святочным арнаментам — ад 20 да 34 рублёў. Электрагірлянды на 400 лямпачак — 82,9 рубля, а, напрыклад, на 576 — 127,99, самая танная — амаль 10 рублёў. Штучныя ёлкі каштуюць ад 90 рублёў за метровую да 600 рублёў за двухметровую.

Прадстаўлены і навагоднія касцюмы. «Маскарадны пудзель» для хлопчыкаў дашкольнага ўзросту можна набыць за 39,99 рубля, «Снегавік» для дзяўчынкі — за 18,79. Касцюм Дзеда Мароза абыдзецца ў 179,99 рубля, Снягуркі — у 169,99. Таксама тут шмат салодкіх падарункаў у коштавым дыяпазоне ад трох рублёў і вышэй. Напрыклад, за ледзянцовую карамель «Ялінка на палачцы» аддасце 3,9 рубля, за набор цукерак на 115 грамаў — 4,29, «Навагоднія хлопцы» на 700 грамаў каштуюць 8,99 рубля, «Мішкавы прысмакі» — 11,99, а маленькі набор «Монстрык» на 380 грамаў — 7,99 рубля. Усё абазначанае — беларускіх вытворцаў.

— Мне больш падабаецца знаёмы з дзяцінства Дзед Мароз, а не Санта Клаус, — падзялілася наведвальніца крамы Таццяна. — Угаварыла мужа купіць менавіта яго. Акуляры, бародка, кій, валёнкі знаёмыя нашаму пакаленню, хоць ён нават даражэйшы, чым замежны. Шкада, што тыя ўпрыгажэнні на ёлку, якія былі ў дзяцінстве, цяпер амаль не сустрэнеш. Кожнае — як твор мастацтва, а зараз быццам без душы. Не хапае эксклюзіўнасці. Гатова пераплаціць, але каб было не так, як ва ўсіх.

### ІГЛІЧНЫ ПАХ І ПЕРАДСВЯТОЧНЫ НАСТРОЙ

На адным з вядомых сталічных рынкаў з самай раніцы ўсё кіпіць: прадаўцы развешваюць тавар, узнімаюць адно аднаму настрой, разглядваюць упрыгажэнні, якія прывезлі іншыя калегі. «Дожджыкі» і мішуру тут прадаюць па 2—5 рублёў за штуку, вялікія зоркі і сняжынкі, што свецяцца, — па 55—80 рублёў, магніцікі і статуэткі з быком — па 2—5 рублёў, хлапушкі будуць каштаваць столькі ж, бенгальскія агні — 1,5—3, агеньчыкі — ад 6 да 20 рублёў. Цацкі ў выглядзе Дзеда Мароза — ад 50 рублёў.

— Колькі ў цябе каштуе гэты чароўны шар? — цікавіцца адзін прадавец у іншага, уважліва разглядаючы яго ў руках, паварочваючы то ўправа, то ўлева, каб атрымліваўся прыгожы «снегапад».

— 120 рублёў, толькі сёння прывёз, — адказвае ўладальнік. — Зараз якраз пішу на таблічцы «не чапаць рукамі» *(усміхаецца)*, вы ўжо парушылі гэта правіла.

Прадавец Пётр расказаў, што зараз актыўна купляюць усё тое, што танней.

— Асаблівай папулярнасцю карыстаюцца папяровыя календары, ды і пластыкавыя бяруць, а таксама тавары, звязаныя з навагодняй сімволікай. Заўсёды імкнуся прывозіць штосьці эксклюзіўнае. Сёлета гэта шары са снегам, якія свецяцца, — па 100 і 120 рублёў. Большасць прадукцыі з Кітая, але ёсць і з Расіі. За якасць адказваю з упэўненасцю, бо працую не першы год. Невялічкія штучныя елкі набываюць з ахвотай, асабліва белага колеру. Вось гэтая, напрыклад, каштуе 50 рублёў (паказвае на пухнатую прыгажуню). Мішуру бяруць розную: ружовага, зялёнага, чырвонага, сіняга колераў. Пра сімвал года — Дзеда Мароза — пытаюцца, але купляюць рэдка, тое ж самае датычыцца іншых вялікіх цацак. Зразумела, больш пакупнікоў прыходзяць у суботу, а калі ў будні, то бліжэй да вечара. Упэўнены, што ўжо праз пару дзён продаж пойдзе нашмат лепш.

Наталля пачала продаж з першага снежня. Адзначае, што многія завітваюць сюды, каб проста ўзняць навагодні настрой. «Гандлюю тут ужо пяць гадоў. Кожны выбірае штосьці зыходзячы з патрэб і магчымасцяў. Заўсёды кажу: з пакупніком важна знаходзіць кантакт, выслухаць, нешта падказаць. Наведвальнікам заўсёды жадаю здароўя і дабра, лічу, што, калі хочаш, каб да цябе нешта прыходзіла, умей аддаваць. Якое б ні было жыццё, трэба глядзець на яго з пазітывам. Таму, калі да мяне падыходзяць нават адзін раз за дзень, ужо вельмі прыемна».

**Дар'я ШЛАПАКОВА,**
**фота аўтара.**



## Паважаныя калегі, работнікі і ветэраны энергетычнай галіны!

Ад імя Міністэрства энергетыкі Рэспублікі Беларусь і ад сябе асабіста віншую вас з прафесійным святам —

## Днём энергетыка!

Энергетычны комплекс займае адно з вядучых месцаў у эканоміцы краіны і вызначае развіццё шматлікіх яе галін. Ад яго эфектыўнай работы залежыць эканамічны дабрабыт дзяржавы, якасць жыцця і камфорт нашых грамадзян.

2020 год быў няпросты ва ўмовах эпідэміялагічнай сітуацыі, якая склалася, зніжэння тэмпаў эканамічнага росту ў свеце, аслаблення гандлёва-эканамічных сувязяў паміж краінамі. Аднак арганізацыі галіны падышлі да яго завяршэння з дастойнымі вынікамі, паспяхова справіліся з галоўнай задачай — па надзейным, бесперабойным энергазабеспячэнні рэальнага сектара эканомікі і насельніцтва.

Гэты год быў адзначаны рэалізацыяй буйных інвестыцыйных праектаў, найважнейшы з якіх — будаўніцтва Беларускай атамнай электрастанцыі. Першы энергаблок БелАЭС, у адпаведнасці з графікам будаўніцтва, у лістападзе падключаны да аб'яднанай энергасістэмы, пачалася выпрацоўка электраэнергіі. Для нашай краіны падзея — гістарычная. Беларусь увайшла ў сусветны атамны клуб, што стала магчыма дзякуючы прафесійнай і суладнай рабоце вялікай каманды беларускіх і расійскіх спецыялістаў. Наперадзе ў нас яшчэ больш адказны этап — увод першага энергаблока ў прамысловую эксплуатацыю.

Важным вынікам работы галіны сталі таксама праекты па рэканструкцыі вузлавых размеркавальных падстанцый «Беларуская», «Ліда», «Баранавічы», «Полацк», уводзе электракатлоў на ЦЭЦ і буйных кацельнях, будаўніцтве пікава-рэзервовых крыніц на аб'ектах энергазабеспячэння ў рамках інтэграцыі БелАЭС у энергасістэму краіны. Мадэрнізуецца і электрасеткавая інфраструктура: за год пабудавана і рэканструявана больш за 1,6 тысячы кіламетраў ліній электраперадачы.

Эфектыўнае развіццё энергетыкі — заслуга кожнага, хто працуе ў галіне. Прыміце словы шчырай удзячнасці за вашу плённую працу, адданасць справе, самааддачу і высокі прафесіяналізм!

Жадаю ўсім вам і вашым блізкім, паважаныя калегі, моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту, аптымізму, новых поспехаў і дасягненняў у прафесійнай дзейнасці на карысць нашай роднай Беларусі!

**Віктар КАРАНКЕВІЧ,**
**міністр энергетыкі**
**Рэспублікі Беларусь.**



## Дарагія сябры, паважаныя калегі, ветэраны энергасістэмы Беларусі!

**Сардэчна віншую вас**

## з Днём энергетыка!

Сёлета наша прафесійнае свята супадае са знамянальнай датай — 100-годдзем прыняцця плана ГОЭЛРО. Прынцып апераджальных тэмпаў развіцця электраэнергетыкі, закладзены гэтым планам, дазволіў ёй стаць базавай галіной эканомікі. Сёння энергетыка стаіць у шэрагу глабальных фактараў устойлівага развіцця чалавецтва. З'яўляючыся рухаючай сілай магутных вытворчасцяў, яна ўваходзіць у кожны дом, сілкуючы яго цяплом і святлом.

Уся грандыёзная моц вялікай энергетыкі створана чалавекам і для чалавека. Менавіта людзі вызначаюць у энергетыцы прастору і час, змяняючы маштабы задач і этапы гістарычнага развіцця. І за гэтай сённяшняй сілай, за строгімі лініямі праектаў і сухімі лічбамі справаздач стаіць усё той жа чалавечы фактар: нязгаснае жаданне тварыць сёння энергію будучыні і ўменне ў любых умовах браць на сябе адказнасць за вельмі складаныя рашэнні.

Абапіраючыся на мудрасць і вопыт мінулых пакаленняў энергетыкаў, мы свята шануем свае прафесійныя традыцыі, закладзеныя ветэранамі галіны. Сёння мы адрасуем ім асаблівыя словы ўдзячнасці за самаадданую шматгадовую працу.

Адыходзячы год быў для ўсіх нас часам выпрабаванняў. Магу з упэўненасцю сказаць, што энергетыкі прайшлі чарговы экзамен на трываласць. Сёння працоўную вахту на прадпрыемствах энергетычнай галіны нясуць тысячы супрацоўнікаў: электраманцёраў, тэхнікаў, інжынераў, дыспетчараў, кіраўнікоў. Кожны на сваім месцы выконвае складаную, важную і вельмі патрэбную работу, і толькі разам нам удаецца рэалізоўваць нашу стратэгічную місію — несці энергію нашым спажыўцам.

Мінулы перыяд быў насычаны падзеямі, якім наканавана вызначыць лёс беларускай энергетыкі на далёкую перспектыву.

Айчынная энергетыка выйшла на новы ўзровень. Электраэнергія ад першага энергаблока Беларускай АЭС паступіла ў сетку. Для гэтага мы выканалі каласальны па маштабах аб'ём работ. Рукамі энергетыкаў у краіне пабудаваны і адрамантаваны сотні кіламетраў ЛЭП, рэалізуюцца мерапрыемствы па рэжымнай інтэграцыі атамнай станцыі, на многіх аб'ектах уведзены ў эксплуатацыю электракатлы, распачата будаўніцтва пікава-рэзервовых энергакрыніц, працягваецца працэс лічбавізацыі і ўкаранення сучасных тэхналогій.

Наступны год — юбілейны. Беларуская энергасістэма пераадолее 90-гадовую мяжу, і гэта прад'яўляе асаблівыя патрабаванні да нашай работы. Бо мы нясём адказнасць перад ветэранамі, якія задалі нам найвышэйшую планку добрасумленных і бескампрамісных адносін да справы.

Паважаныя калегі-энергетыкі, дзякую вам за працу, за праяўленыя стойкасць і вытрымку. Вашы прафесіяналізм, веды і вопыт служаць залогам таго, што энергааб'екты, якія мы ўзводзім і эксплуатуем, будуць служыць доўгія гады на карысць краіны.

Няхай надыходзячы год будзе ўдалы не толькі для энергетыкі, але і для кожнага з вас. Хай будзе менш падстаў для турбот і больш — для гонару. Жадаю ўсяму калектыву моцнага здароўя і дабрабыту, беражыце сябе!

**Павел ДРОЗД,**
**генеральны дырэктар ДВА «Белэнерга».**

УНП 101339243



# НАМАЛЯВАНЫЯ АТАМЫ АЦЭНЬВАЛІ НА КОНКУРСЕ

**Восем канкурсантаў у дзвюх узроставых катэгорыях сталі найлепшымі аўтарамі работ сярод больш як 2100 малюнкаў, якія даслалі на творчыя спаборніцтвы, прымеркаваныя да 75-годдзя атамнай галіны, юныя мастакі.**

Конкурс зладзілі Дзяржкарпарацыя «Расатам» і сталічны інфармацыйны цэнтр па атамнай энергетыцы ў партнёрстве з Мінадукацыі і Мінэнергетыкі, прадпрыемствамі «Белэнерга», Беларускай АЭС і Расійскім цэнтрам навукі і культуры ў Мінску. Работы ацэньвала экспертнае журы з прадстаўнікоў профільных міністэрстваў і ведамстваў.

— Галоўная мэта конкурса малюнкаў — сфарміраваць у дзяцей і моладзі пазітыўнае стаўленне да мірнага атама, яго служэння людзям як экалагічна прыязнай крыніцы энергіі, — расказала **Лілія ДУЛІНЕЦ, намеснік дырэктара дэпартамента па ядзернай энергетыцы Міністэрства энергетыкі, старшыня журы.** — Думаю, такія конкурсы стануць традыцыйнымі і дапамогуць далучыць моладзь і падрастаючае пакаленне да прагрэсіўных, высокатэхналагічных сфер выкарыстання энергіі атама, у тым ліку да ядзернай энергетыкі.

У сваіх творах канкурсанты паказалі магчымасці атама ў медыцыне і ў асваенні космасу, намалявалі прафесіі атамнай галіны, якія ўжо існуюць і якія, магчыма, з'явяцца ў будучыні, паказалі, як яны бачаць АЭС. Многія ўдзельнікі конкурсу нават прадставілі ідэю развіцця безвугляродных крыніц генерацыі — мадэль «Зялёны квадрат».

— Цудоўна, што канкурсанты раскрылі менавіта экалагічныя падыходы да фарміравання энергетыкі будучыні, — заўважыў **Уладзімір ГОРН, намеснік дырэктара Рэгіянальнага цэнтра Дзяржкарпарацыі «Расатам» па Усходняй Еўропе.** — Сёння ва ўсім свеце назіраецца рост ужывання энергарэсурсаў. Каб не спыняць прагрэс, удзельнікі конкурсу прапаноўваюць рашэнне — пераходзіць на экалагічна чыстыя віды генерацыі. Камбінацыя энергіі ветру, вады, сонечнай і атамнай генерацыі дазволіць дасягнуць значнага зніжэння выкідаў $CO_2$ у атмасферу і вырашыць актуальныя сацыяльныя і эканамічныя праблемы.





Першае месца ва ўзроставай катэгорыі ад 6 да 12 гадоў заняла Сафія МАЗУРЭНКА (гімназія № 1, г. Орша). Другое — Аліса ЖОЛУД (Ушацкі раённы цэнтр дзяцей і моладзі). Трэцяе — Маргарыта АНТОНЕНКА (Палац творчасці дзяцей і моладзі, г. Гомель). Ва ўзроставай катэгорыі ад 13 да 31 года пераможцам журы вызначыла Вікторыю ХАРЫТАНЮК (сярэдняя школа в. Астрамечава). Другое месца прысудзілі Ганне ДАРАНЬКО (сярэдняя школа № 72, г. Гомель). Трэцяе — Аліне ГРЫЦОВАЙ (сярэдняя школа № 13, г. Брэст).

Малюнак Міланы РЭУТ з гімназіі № 1 г. Валожына перамог галасаванні за «Прыз глядацкіх сімпатый». А прадстаўнікі «Расатама» адзначылі спецыяльным прызам работу Сафіі ЛОСІЧ з г. Драгічын. Спецыялісты лічаць, што твор гэтай канкурсанткі адпавядае падыходам кампаніі па дасягненні Мэт устойлівага развіцця і скарачэнні выкідаў парніковых газаў.

Малюнкі пераможцаў можна пабачыць на Facebook-старонцы адукацыйнага праекта «Расатама» https://www.facebook.com/LookAroundBelarus/.

**Ірына СІДАРОК.**

З нагоды

# Высакародная педагагічная справа

## Вось ужо 75 гадоў шчыра адлюстроўвае яе на сваіх старонках «Настаўніцкая газета»

**Адна з прафесій, для якіх немагчыма вылічыць аб'ём работы, колькасць рэальна адпрацаваных гадзін, — настаўнік: ні на хвіліну не спыняе ён сваёй працы. Педагог пастаянна ў працэсе работы, нават калі, здавалася б, фармальна свабодны. У такіх няпростых умовах надзвычай важнае адчуванне адзінства са сваёй прафесійнай супольнасцю, усведамленне агульнай місіі, каштоўнасцяў, традыцый. У гэтым — выключная роля прафесійнай прэсы.**

Роўна 75 гадоў побач з выхавальнікамі дзіцячых садкоў, педагогамі сярэдніх і сярэдніх спецыяльных устаноў адукацыі, прафесарска-выкладчыцкім складам ВНУ краіны «Настаўніцкая газета». Першы нумар яе выйшаў у Мінску 20 снежня 1945-га.

З гэтай нагоды ўчора ў Нацыянальным гістарычным музеі па вуліцы Карла Маркса, 12 у Мінску адбылося ўрачыстае адкрыццё часовай экспазіцыі **«Настаўніцкая газета». 75 гадоў з асветнікамі Беларусі».** Некалькі месяцаў супрацоўнікі газеты і Нацыянальнага гістарычнага музея працавалі над канцэпцыяй выстаўкі і падборам экспанатаў, каб умясціць насычаную гісторыю выдання ў кампактную экспазіцыю. Тут прадстаўлены рэдкія архіўныя дакументы, фотаздымкі, узнагароды, асабістыя рукапісы першага рэдактара газеты ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны А. С. Крушынскага. Аляксей Сцяпанавіч з канца чэрвеня 1941 года ўдзельнічаў у падпольным і партызанскім руху на тэрыторыі Беларусі. Вёў падпольную работу ў Оршы. З-за пагрозы арышту быў накіраваны начальнікам разведкі, а потым начальнікам штаба атрада К. Я. Варашылава партызанскай брыгады Канстанціна Заслонава. У кастрычніку 1945 года быў прызначаны рэдактарам толькі што створанай «Настаўніцкай газеты».

Іншыя прадметы выстаўкі ілюструюць цікавыя праекты і кірунк дзейнасці газеты, а таксама нагадаюць наведвальнікам пра прафесіяналізм, адданасць журналістаў «Настаўніцкай газеты» сваёй нялёгкай справе.

Трэба сказаць, што сёння свята не толькі ў «Настаўніцкай газеты»: цяпер гэтае выданне з'яўляецца часткай рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Педагагічная прэса», які выпускае ў свет не толькі «Настаўніцкую газету», але таксама навукова-педагагічны часопіс «Народная асвета», газеты для падлеткаў «Переходный возраст» і «Раніца», газеты для замяшчальных сем'яў і спецыялістаў у галіне сямейнай псіхалогіі адносін «Домой!», часопіса аб беларускім спорце «Спортtime». Свята — ва ўсіх!





**Міністр інфармацыі Ігар ЛУЦКІ,** вітаючы калектыў рэдакцыі на адкрыцці выстаўкі, адзначыў, што старонкі «Настаўніцкай газеты» — сапраўдны летапіс айчыннай адукацыі, гісторыі станаўлення і развіцця беларускай педагогікі: «Газетныя публікацыі ўсебакова і поўна асвятляюць найважнейшыя падзеі сучаснай асветы і жыцця нашай краіны, праблемы сярэдняй і вышэйшай школы і шляхі іх вырашэння, дасягненні навукоўцаў і творчых студэнтаў — усё гэта, безумоўна, дзякуючы зладжанай рабоце творчага калектыву. Газета адкрыта для шырокай і кампетэнтнай дыскусіі па праблемах маральна-духоўнага і прафесійнага выхаванння і навучання падрастаючага пакалення».

У прывітанні **міністра адукацыі Ігара КАРПЕНКІ** адзначалася асаблівая роля «Настаўніцкай газеты» як трыбуны для абмену педагагічным вопытам. Па словах міністра, «за 75 гадоў на газетных старонках былі адлюстраваны лёсы тысячы айчынных педагогаў, людзей самых розных пакаленняў. Настаўнік — не проста прафесія, гэта лёс, своеасаблівы спосаб жыцця — жыцця на карысць дзяцей і грамадства краіны».

Завіталі на мерапрыемства і творчыя сябры «Настаўніцкай газеты», сярод якіх і **дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ,** які адзначыў: «Настаўніцкая газета» — унікальны рухавік новых інавацыйных ідэй у грамадстве». А на думку **дырэктара Нацыянальнага гістарычнага музея Паўла САПОЦЬКІ,** 75 гадоў для галоўнага педагагічнага выдання краіны — «не проста ўзрост, а паказчык даверу чытача, адлюстраванне прафесіяналізму рэдактараў і журналістаў газеты, якія з годнасцю трымаюць планку і захоўваюць гісторыю і памнажаюць традыцыі выдання».

«Мы працуем для людзей, — сказаў у сваю чаргу **дырэктар — галоўны рэдактар «Выдавецкага дома «Педагагічная прэса» Вадзім КНЫШАЎ.** — Таму што і журналістыка, і педагогіка — гэта пра людзей. І ў сённяшняй экспазіцыі яно асабліва падкрэслена. Мы імкнуліся аб'яднаць мінулае і сучаснасць, паказаўшы як гісторыю ўзнікнення газеты і этапы яе дзейнасці на адукацыйнай прасторы Беларусі, так і сучасныя грамадска важныя праекты, якія рэалізуе «Настаўніцкая газета», а таксама выданні Выдавецкага дома. Гэтая выстаўка дазваляе ацаніць уклад газеты ў станаўленне і развіццё педагагічнай супольнасці нашай краіны, убачыць, як на старонках газеты адлюстроўваецца высакародная педагагічная справа».

Дарэчы, да юбілею супрацоўнікі газеты адшукалі ў архівах Расійскай нацыянальнай бібліятэкі ў Санкт-Пецярбургу адзін з першых нумароў свайго выдання (№ 2 за 27 снежня 1945 года) і ў якасці падарунка дзеляцца знойдзеным рарытэтам са сваімі чытачамі. Рэпрынтная копія газеты змешчана ўкладкай у суботнім нумары.

**Анатоль СЛАНЕЎСКІ.**
**Фота Уладзіміра ФАЛАЛЕЕВА і Алега ІГНАТОВІЧА.**

Дзеля памяці

# ДЗІЦЯЧЫ ПІСЬМЕННІК УЛАДЗІМІР ПАЎЛАЎ

**Уладзімір Паўлаў у маім пісьменніцкім даведніку пакінуў прарочыя словы: «Хай родзіць і росіць роднае слова». І я паставіў бы гэта выказванне эпіграфам да жыцця слыннага пісьменніка Беларусі.**

Як і многія майстры Слова, Уладзімір Андрэевіч Паўлаў — выхадзец з вёскі, дзе спрадвеку жыла і жыве сакавітая, меладычная, вострая, вобразная мова беларусаў. Яна ўліваецца дзіцяці разам з малаком мамы, з яе калыханкамі, з яе мудрымі павучаннямі, прымаўкамі, прыказкамі.

Вось і для Уладзіміра Паўлава ўзлётнай паласой у літаратуры стала вёска Замошша Любанскага раёна. Я бываў частым госцем у тым раёне, дзе Янка Купала пісаў паэму «Над ракой Арэсай». Там усё люба: з любасцю ўжываецца ў побыце родная мова, з любоўю пестуюцца дзеці, якія дужа моцна сябруюць з беларускай «Вясёлкай».

Пра незабыўнага Уладзіміра Паўлава, душа якога адляцела ў рай (веру, менавіта ў рай!) восенню 2020 года, крытыкі і даследчыкі беларускай літаратуры яшчэ напішуць шмат добрых слоў. У яго кнігах вершаў «Узлётная паласа», «Сонца купаецца», «Каласы радкоў», у яго кнігах прозы «Пажарніца», «Годы нашы — птушкі», «Ад агню і мяча», «Чуж-чужаніца» шмат праўды, шмат творчых вобразаў. У яго кнігах — наша жыццё на тым этапе явы, на якім яму выпала доля тварыць, быць актыўным змагаром за Айчыну.

Я ж хачу адзначыць Уладзіміра Паўлава найперш як дзіцячага паэта. Ён не так многа напісаў для юных чытачоў, але яго слова прыкметнае, вобразнае, дасціпнае і, веру, жывучае, запатрабаванае.

У свой зборнік для дзяцей «Згадка на дабро» Уладзімір Паўлаў уключыў вершы, забаўлянкі-пазнаванкі, загадкі і паэму-казку. Вельмі цікавы, карысны падарунак паэта. Ганаруся, што ён дастаўся і мне з подпісам аўтара.

Лірычна, тонка, займальна Уладзімір Паўлаў даводзіць сваім дасціпным чытачам, як жа трэба слухацца маму. А ў прыклад ставіць зайчыка, які аднойчы парушыў маміну просьбу, каб не адыходзіў ад яе:

*Ад сям'і сваёй адбіўся,*
*Загуляўся, заблудзіўся.*
*А тут цемра наступае,*
*і сава, чутно, лятае.*
*Сеў пад кусцік, вушкам водзіць:*
*Можа, блізка й воўк дзе ходзіць?!*
*Ах, як страшна, як няўтульна!..*
*Як адрэзаны акрайчык,*
*Аказаўся...*
*Плача зайчык.*

Усе вершы паэта з ненавязлівай мараллю, хутчэй, падказкай ад мудрага, сталага чалавека, які тонка адчувае струны душы дзіцяці.

Укладвае дзяўчынка лялек спаць. Тыя не хочуць яе слухацца, і маленькая мама разумее, чаму яе мамачцы не спіцца. Карысныя падказкі чытачам закладзены ў вершах «Якалы», «Чысцёха», «Коцябраце», «Расці, Максім!».

Раздзел «Забаўлянкі-пазнаванкі» пабудаваны арыгінальна, скіраваны на тое, каб малы чытач не толькі агучваў для сябе тэкст, а задумваўся над ім і быў асцярожны, бо дзядзька-паэт Уладзімір Андрэевіч падкідвае для роздуму шмат пазнаванак.

*У паношаны камзол*
*Сунуў хлеба лусту*
*І пайшоў стары казёл*
*Вартаваць капусту.*

Але ж чакайце, не вельмі давярайце хітраму аўтару. Хіба можна пускаць казла ў агарод вартаваць капусту? Капуста для яго — найлепшы ласунак, і ён яе не ўвартуе, а ўсю пахрумкае.

З такімі ж нечаканкамі паэт пабудаваў вершы-пазнаванкі «Калі цвіце папараць», «Буслік», «Бурак і гарбуз», «Барсук», «Вадзяныя жывёлы», «Дрэвы» ды іншыя.

Вось такі дзіцячы паэт Уладзімір Паўлаў. Пусціў сваім чытачам «на разагрэў» свае забаўлянкі, а ў канцы кнігі, «на закуску», прыдумаў сто трыццаць загадак ды паэму-казку «Пра Янку, Ганку і казак вязанку».

Пра стог загадак можна пісаць цэлае даследаванне. Яны самі па сабе заманлівыя, бо вымушаюць думаць, раздумваць. Але Уладзімір Паўлаў як бы ўдасканаліў гэты жанр, прыдумаў загадкі на, здавалася б, неверагодныя рэчы, з'явы: пра баабаба, тэлебачанне, засуху, хмары ў вадзе, цень у хаце, гарошыны ў струку, цвік у абутку, след ад самалёта...

Пра паэму-казку, якая разышлася тыражом толькі ў дзве тысячы экзэмпляраў, мушу сказаць асобна. Веру: у нашай дзіцячай літаратуры яна зойме асаблівае месца. Адметнае. Бо, зноў жа, пабудавана на нечаканасцях, якія вельмі падабаюцца дзецям.

Паэт вядзе сваіх герояў Янку і Ганку ў лес. Яны — блізняты, юныя даследчыкі, хочуць пра ўсё дазнацца. Ім у лесе ўсё цікава: і куст ажыны, і «цар грыбоў», і арэшнік з арэхамі... Загуляліся дзеці ў лесе дый заблудзіліся. І здарылася з імі неверагоднае. Раптам з дуба Чарадзея выйшаў дзед Дабрадзей, «падперазаны паяском слуцкае работы». Нечаканы казачнік прапануе дзецям вандроўку ў звышпадарожжа. На светлалёце, падобным на празрысты, імклівы шар, яны паляцелі ў Свет Адваротны. Там усё не так, як у вёсцы: жаба гоніцца за буслом, у валёнкі жук абуўся, варона спявае, як салавей, «на пакорлівай лісе едзе певень верхам». Цуд!

А далей дзед Дабрадзей скіраваў свой шар ажно ў космас. Там яны пазнаёміліся з усімі планетамі, якія ёсць вакол Сонца. Па-іншаму ўбачылі сваю Зямлю. Яна падалася ім сінім прывабным акенцам у Сусвеце. Янка і Ганка просяць чарадзея вярнуць іх дамоў, бо найлепш дома, з мамай, татам, сябрамі...

Паэта, празаіка Уладзіміра Паўлава можна і трэба адкрываць нанова. Сціплы ў жыцці, патрабавальны ў літаратуры, ён заслугоўвае таго, каб сучасная моладзь перачытала яго кнігі — дарагую ўсім нам духоўную спадчыну. Калі пісьменніка не стала сярод нас, усе адчулі, што збяднелі на выдатную асобу, каля якой непрыкметна грэліся, наталяліся. Давайце не спазняцца гаварыць пахвальныя словы жывому аўтару, каб не прыйшлося рабіць гэта са слязою на вейцы. Тайны космасу — цалік, іх ніхто да канца яшчэ не зведаў. Дык не стомімся і мы адкрываць космас душы і таленту тых, хто быў, хто ёсць каля нас, у яве райскага жыцця.

**Уладзімір ЛІПСКІ.**

# ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**

Продавец: **ОАО «Житковичлес»** (УНП400049968) 247960, Гомельская обл., г. Житковичи, ул. К. Маркса, 80, в лице ликвидатора Лобко Александра Николаевича, тел. 8 (02353) 2-18-74.

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **22 января 2021 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов | Местонахождение | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|---|
| 1 | Машина транспортно-погрузочная лесная МТПЛ-5-11, гос. № ЕК-3 5445, 2018 г. в. | 1 | 36 000,00 |
| 2 | Машина транспортно-погрузочная лесная МТПЛ-5-11, гос. № ЕК-3 5448, 2018 г. в. | 1 | 36 000,00 |
| 3 | Автомобиль УАЗ 390995-460-04 № 0407-3 АМ, 2017 г. в. | 1 | 17 000,00 |
| 4 | Ванна пропиточная механизированная серии ТР1 мод. MIZ 1,5*1,5*6,5-R, 2019 г. в. | 2 | 35 000,00 |
| 5 | Телескопический погрузчик Manitou MT732, гос. № ЕК-3 7138, 2010 г. в. | 1 | 62 000,00 |
| 6 | Дробилка бараб. типа Skorpion 350EB/2, подающ. тр-р 6 м, выиг. 3 м и 7 м, 2019 г. в., сер. № 081, 2019 г. в. | 3 | 134 400,00 |

**Местонахождение:**
**1 – Гомельская обл., г. Житковичи, ул. Комсомольская, 45а,**
**2 – Гомельская обл., Житковичский р-н, п. Хвоенск,**
**3 – Гомельская обл., Лельчицкий р-н, д. Милошевичи,**
**тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-18.**

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 23.12.2020 г. 09.00 по 21.01.2021 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY, 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

# ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 06 января 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)* |
|---|
| Нефтепродукт – обводненное (с примесями) сырье для производства нефтяных вязких дорожных битумов в количестве 1100 тонн (ориентировочно), содержащийся в битумохранилищах, расположенных по следующим адресам: Минская область, Вилейский район, г. Вилейка, ул. Волкова, 43; Минская область, Минский район, г. Заславль, ул. Заводская 17/3; Минская область, Слуцкий район, Козловичский с/с, д. Великая Слива, АБЗ-2 |
| Начальная цена: 245 520,00 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка: 24 500,00 бел. руб. |

** Покупатель обязуется самостоятельно произвести выемку содержимого битумохранилищ (продаваемого имущества). Окончательное количество продаваемого имущества определяется по мере выборки нефтепродукта с учетом его взвешивания.*

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **06 января 2021 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 23.12.2020 по 04.01.2021 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**

Центр Промышленной Оценки
- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5** |
| **Продавец** | **ОАО «МИЛКАВИТА», г. Гомель, ул. Бр. Лизюковых, 1** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |
| **Предмет электронных торгов** | |
| **Лот № 1 (имущество реализуется одним лотом) Адрес – Гомельская обл., г. Лоев, ул. Царикова, д. 39** | |
| **Производственная база** в составе: **бытовые помещения** (340/С-293597, 58,5 кв. м), **здание конторы** (340/С-293567, 52,2 кв. м), **склад** (340/С-293569, 115,9 кв. м), **здание производственного корпуса** (340/С-293570, 267,5 кв. м, составные части: два забора, трое ворот, асфальтное покрытие), **котельная** 340/С-293568, 100,2 кв. м, составные части: труба дымовая (h=24м), емкости для топлива 2 шт. по 6 куб. м), **гараж** (340/С-293565, 82,3 кв. м). ***Сведения о земельном участке***: предоставлен продавцу пл. **0,3603 га** на праве постоянного пользования для обслуживания зданий и сооружений молочного завода. Ограничения (обременения) – находится в водоохранных зонах | |
| **Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 121 449,66 бел. руб.** (снижена на 20 %) | |
| **Лот № 2 Адрес – Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, ул. Карла Маркса, 25-16** | |
| **Квартира** (расположена в пятиэтажном жилом доме 2010 г. п. на 4-м этаже и состоит из двух жилых комнат, 340/D-219285; 66,5 кв. м) | |
| **Начальная стоимость лота № 2 без НДС – 68 960,00 бел. руб.** (снижена на 20 %) | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в ОАО «Белинвестбанк» (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | |
| **Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение **3 (трех)** рабочих дней после проведения электронных торгов | |
| Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 05.11.2020 | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов – 13.01.2021 в 14.00. Окончание торгов – 13.01.2021 в 15.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 11.01.2021 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
**(Организатор аукциона)**
**извещает о проведении повторного открытого аукциона со снижением цены на 70 % по продаже имущества ОАО «БПХО»**

**Лот №** 1, состав: 1. Ремонтно-строительный цех, инв. № 110/С-86164, 2307,7 кв. м, г. Барановичи, ул. Фабричная, 13В. 2. Здание склада РСЦ, инв. № 110/С-102697, 200,1 кв. м, г. Барановичи, ул. Фабричная, д. 13В/1. 3. Закрытый склад РСЦ, инв. № 110/С-102693, 628,2 кв. м, г. Барановичи, ул. Фабричная, 13В/2. 4. Автостоянка, инв. № 110/С-102634, 2603 кв. м, г. Барановичи, ул. Фабричная, д. 17. 5. Гараж на три автомашины, инв. № 110/С-102636, 187,4 кв. м, г. Барановичи, ул. Фабричная, д. 13Б/1. 6. Пост охраны № 8, инв. № 110/С-102583, 3,9 кв. м, г. Барановичи, ул. Фабричная, д. 13Б/2. 7. Благоустройство РСУ, инв. № 110/С-111836, 8818 кв. м, г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, благоустройство РСУ. 8. Трубопровод сетевой воды от ТКЗА до РСЦ, инв. № 110/С-111717, 80,4 м, г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, трубопровод сетевой воды от ТКЗА до РСЦ. 9. Трубопровод хозпитьевой воды от ВК-22А до РСУ, инв. № 110/С-111758, 179,4 м, г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, трубопровод хозпитьевой воды от ВК-22А до РСУ. 10. Участок канализационной сети от РСУ до КК-116, инв. № 110/С-111721, 187,6 м, г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, участок канализационной сети от РСУ до КК-116. 11. Кабельная линия КЛ 0,4кВ от НЩ-0,4 кВ ТП-ЦМЛМ до ЩО «Автостоянка», инв. № 050009, 245,6 м, г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, кабельная линия КЛ 0,4кВ от НЩ-0,4 кВ ТП-ЦМЛМ до ЩО «Автостоянка». 12. Кабельная линия КЛ 0,4кВ от НЩ ЦМЛМ до РУ «РСУ», инв. № 050007, 122,5 м, г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, кабельная линия КЛ 0,4кВ от НЩ ЦМЛМ до РУ «РСУ». 13. Кабельная линия 0,4 кВ от НЩ ЦМЛМ до РП «Пилорама», инв. № 050008, 128 м, г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, кабельная линия 0,4 кВ от НЩ ЦМЛМ до РП «Пилорама».

Обременения: Решение о снятии запрета на осуществление регистрационных действий в отношении капитальных строений (поз. 1–4) будет принято не позднее дня, следующего за днем поступления всех денежных средств, вырученных от реализации недвижимого имущества, на депозитный счет Министерства юстиции Республики Беларусь (письмо Министерства юстиции Республики Беларусь). **Начальная цена** с НДС – 253 328,40 руб. **Задаток** – 50 000,00 руб. Земельный участок 141000000006002693, 1,8890 га, право аренды СЭЗ «Брест» по 22.08.2046.

**Аукцион состоится 22.01.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Окончание приема заявлений и задатков – **20.01.2021 в 11.00.**

**☎ Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

Центр Промышленной Оценки
- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «ТРЕСТ № 26 ЖЕЛЕЗОБЕТОНМОНТАЖ», г. Минск, 220073, ул. Харьковская, 15, +375173958917, +375293928906** |
| **Предмет аукциона: капитальные строения, реализуемые одним лотом** | |
| **Открытый склад металла № 1** (сооружение специализированное складов, хранилищ) общей площадью 10146,7 кв. м, инвентарный номер 350/С-187388, по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 254В. Составные части и принадлежности: площадка, подкрановая балка, погрузочно-разгрузочная площадка, лоток для электрокабеля, ворота (Е), ограждение (Ж), площадка, дорожка (И) | |
| **Здание теплопункта** (здание специализированное энергетики) общей площадью 42,9 кв. м, инв. номер 350/С-88096, по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 254. Составные части и принадлежности: отмостка | |
| **Начальная цена без НДС** – 307 800,00 белорусских рублей **Шаг аукциона** – 15 390,00 белорусских рублей | |
| Порядок ознакомления с предметом аукциона осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00. Ответственное лицо: Дриневский Виктор Васильевич, тел. +375(29) 603 49 02 | |
| **Дополнительная информация**: регистрация перехода права собственности на предмет аукциона к Покупателю будет осуществляться в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь № 63 от 05.02.2013 «О некоторых вопросах правового регулирования процедур экономической несостоятельности (банкротства)». Государственная регистрация договора купли-продажи и перехода права собственности на объекты недвижимости осуществляется Покупателем самостоятельно за свой счет | |
| Лица, желающие принять участие в торгах обязаны внести задаток и подать организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390 | |
| **Порядок оформления участия в торгах, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов определяется ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)»** | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | |
| Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее **30 (тридцати) дней** со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов | |
| Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору в размере 3 % от цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте **www.cpo.by** | |
| **Аукцион состоится 25.01.2021 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703** | |
| **Для участия в аукционе необходимо перечислить организатору торгов задаток, а также подать заявление с приложением всех необходимых документов в срок с 9.00 22.12.2020 до 17.00 21.01.2021 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | |

**Контактные телефоны: +375 29 317-95-42; +375 44 704-92-06.**
**E-mail: auction@cpo.by**

# ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел. 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**

Продавец: **ОАО «СДСК»** (УНП 400024628) 247439, Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Заводская, 10, в лице антикризисного управляющего ООО «Правовая стратегия», тел. + 375 (17) 396-61-34.

Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **12 января 2021 г. в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28

| № п/п | Предмет торгов, местонахождение | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 342/С-72984 общей площадью 207,0 кв. м (здание склада одноэтажное из кирпича и железобетонных панелей), Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Заводская, 6А | 16 200,00 |
| 2 | Капитальное строение с инв. № 342/С-72804 общей площадью 413,0 кв. м (здание склада № 2 одноэтажное кирпичное), Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Заводская, 6Б | 30 780,00 |
| 3 | Капитальное строение с инв. № 342/С-74404 общей площадью 265,5 кв. м (здание склада одноэтажное панельное), Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Заводская, 6Г | 17 550,00 |
| 4 | Грузовой автобетоносмеситель МАЗ 533702 280 СМБ-249, 2006 г. в., рег. знак АК 8701-3, Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Заводская, 10 | 10 260,00 |

Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-03.

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 23.12.2020 г. 09.00 по 11.01.2021 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 25.09.2020 г.

Грамадская ініцыятыва

# ШКОДНЫЯ ЛЕКІ, КАЛІ ЯНЫ Ў РЭКАХ

## У Беларусі ўводзіцца асобны збор пратэрмінаваных лекавых сродкаў

**Вы наводзілі парадак у хатняй аптэчцы, знайшлі пратэрмінаваныя таблеткі і звыкла панеслі іх да сметніцы? Не спяшайцеся! Лепш даведайцеся, ці ёсць у вашым горадзе пункт збору непрыдатных лекавых сродкаў, і калі так, не палянуйцеся адвезці пілюлі туды.**



### Фармацэўтычныя адходы — новая глабальная пагроза

Сусветная арганізацыя аховы здароўя папярэджвае пра забруджванне навакольнага асяроддзя фармацэўтычнымі рэчывамі як пра новую глабальную экалагічную пагрозу. Па ўсім свеце ў вадаёмах ад азёр да акіянаў і нават у пітной вадзе выяўляецца прысутнасць лекаў. Антыбіётыкі, нейралептыкі, анестэтыкі, гарманальныя і іншыя прэпараты трапляюць у арганізмы марскіх і прэснаводных жывёл, вадаплаўных птушак і выклікаюць у іх хваробы, анамальныя паводзіны, прыводзяць да бясплоднасці і вымірання. Зразумела, што і людзям шкодна атрымліваць з кубачкам вады ці гарбаты незаўважныя дозы лекаў, якія ім не прапісвалі дактары.

Значная доля былых лекавых сродкаў трапляе ў вадаёмы з каналізацыі, прасочваецца ў грунтавыя воды са сметнікаў. Так, у Балтыйскае мора штогод зліваецца каля дзвюх тысяч тон фармацэўтычных адходаў. Ці нясуць частку гэтага таксічнага грузу і нашы рэкі? Магчыма, што так. У пробах вады і актыўнага глею, узятых на ачышчальных станцыях некалькіх буйных беларускіх гарадоў, выяўлены сляды цыпрафлаксацыну, левафлаксацыну, дратаверыну, дыклафенаку, эстрадыёлу.



### Час збіраць лекі асобна!

Зменшыць некантраляванае фармацэўтычнае забруджванне дапаможа асобны збор пратэрмінаваных лекавых сродкаў у насельніцтва з наступнай утылізацыяй. Гэта практыка ўжо ўкаранілася ў большасці краін Еўропы. Цяпер яна паступова ўводзіцца і ў нас.

З 1 верасня 2020 года ўступіў у сілу новы ТКП (тэхнічны кодэкс усталяванай практыкі) 17.11-08-2020 (33040-33140) «Ахова навакольнага асяроддзя і прыродакарыстанне. Правілы абыходжання з камунальнымі адходамі». Пратэрмінаваныя лекавыя сродкі выдзелены ў асобную групу камунальных адходаў (п. 3.16) і падлягаюць асобнаму збору (п. 7.2). Распрацоўка формы адмысловых кантэйнераў, выдзяленне месцаў для збору і вырашэнне іншых арганізацыйных задач ускладзена на мясцовыя выканаўчыя органы ўлады і работнікаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

Аднак першы кантэйнер для збору пратэрмінаваных лекаў з'явіўся яшчэ два гады таму ў Мінскай гарадской паліклініцы № 40. Усталяваў яго Цэнтр экалагічных рашэнняў.

— За першы год мінчане прынеслі 35,8 кілаграма фармацэўтычных адходаў, а за другі — ужо 77,4 кілаграма. У гэтай масе пераважаюць прэпараты для лячэння касцёва-мускульнай і дыхальнай сістэм, на другім месцы — для стрававальнага тракту і абмену рэчываў, на трэцім — сардэчныя лекі, — кажа **каардынатар праекта Наталля БЛЫШЧЫК.**

У снежні 2019 года партнёрам Цэнтра экалагічных рашэнняў стаў Цэнтр экалагічнага і сацыяльнага развіцця. Яго стваральнікі, жыхары Баранавіч Вікторыя і Яўген Калач, абвясцілі пілотны праект «Прырода без фармацэўтычных адходаў». Сумеснымі намаганнямі грамадскіх эколагаў да канца 2020 года пункты збору пратэрмінаваных лекаў з'явіліся ўжо ў 13 гарадах: Баранавічах, Беразіне, Барысаве, Брэсце, Вілейцы, Іванаве, Круглаках, Мінску, Наваполацку, Пінску, Полацку, Смілавічах і Чэрвені. Яны размешчаны ва ўстановах аховы здароўя, адукацыі, культуры.

— Мы разглядаем магчымасці паставіць аналагічныя кантэйнеры ў Гомелі, Гродне, Бабруйску, Оршы, — дзяліцца найбліжэйшымі планамі Вікторыя Калач. — Першапачаткова хацелі далучыць да праекта толькі тыя гарады, у якіх жыве больш за 50 тысяч чалавек. Але атрымалі шмат водгукаў і просьбаў з малых гарадоў усталяваць і ў іх хоць бы па адным кантэйнеры. Аказваецца, экалагічна дасведчаныя мясцовыя жыхары самастойна праводзяць акцыі, на якіх тлумачаць пра шкоду лекаў для прыроды, збіраюць пратэрмінаваныя таблеткі... Таму мы гатовы падтрымаць добрую ініцыятыву і дапамагчы арганізаваць збор фармацэўтычных адходаў таксама ў невялікіх населеных пунктах.

### Кантэйнер поўны, а што далей?

Грамадскія эколагі супрацоўнічаюць з Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэтам. На кафедры фармацэўтычнай хіміі вядзецца статыстыка лекаў, вынятых з кантэйнераў, і распрацоўваецца хімічны метад іх утылізацыі.

Пасля статыстычнага даследавання лекі адвозяць на камунальнае ўнітарнае прадпрыемства па абыходжанні з адходамі «Экарэс», дзе іх спальваюць пры высокай тэмпературы. Аднак гэты метад не зусім бяспечны: у атмасферу вылучаюцца забруджвальнікі — дыяксіны. Магчымая альтэрнатыва — мяккая хімічная ўтылізацыя.

— У адпаведнасці з хімічнай структурай лекаў мы падзялілі іх на дзясятак груп. Для кожнай групы падабралі рэактывы, якія ператвараюць медпрэпараты ў рэчывы, пазбаўленыя біялагічнай актыўнасці. Гэтыя адходы ўжо бясшкодныя, іх можна змываць у каналізацыю, — тлумачыць **загадчык кафедрай, кандыдат фармацэўтычных навук, дацэнт Наталля ЯРАНЦАВА** *(на фота)* — Трансфармацыя ажыццяўляецца ў невялікім, аб'ёмам да дзесяці літраў, рэактары. На нашай кафедры карыстаемся эксперыментальнай мадэллю. У будучым такія кампактныя рэактары можна будзе размяшчаць у аптэках, паліклініках і іншых медустановах.

Кафедра фармацэўтычнай хіміі таксама распрацоўвае мабільную праграму, якая дапаможа кожнаму чалавеку разабрацца ў свеце лекаў і БАДаў, падкажа, ці варта аднесці непатрэбны прэпарат у спецыяльны кантэйнер, і пакажа адрасы пунктаў збору.

**Таццяна СЕВАСЦЬЯНАВА.**
**Фатаграфіі дадзены Цэнтрам экалагічнага і сацыяльнага развіцця.**

### Частыя пытанні пра фармацэўтычныя адходы

**— Якія прэпараты не падлягаюць спецыяльнай утылізацыі?**

— БАДы, вітаміны, раслінныя прэпараты можна выкінуць у агульную сметніцу, водараставаральныя лекі — выліць у каналізацыю.

**— Якія медыцынскія сродкі нельга кідаць у спецыяльны кантэйнер?**

— Шпрыцы, тэрмометры, выкарыстаныя перавязачныя матэрыялы, вадкія прэпараты ў флаконах і ампулах.

**— Што рабіць з непатрэбнымі таблеткамі, калі ў маім горадзе няма кантэйнера для асобнага збору лекаў?**

— Рэкамендуецца павымаць таблеткі з упакоўкі, стаўчы ў парашок. Высыпаць гэты парашок у непразрысты пакецік ці слоік са шчыльнай накрыўкай і перамяшаць з чымсьці відавочна неядомым: скарыстаным напаўняльнікам для кацінага туалета, старой заваркай ці кававай гушчай. Герметычна закрыць і выкінуць. Сэнс гэтага дзеяння ў тым, каб людзі ці жывёлы выпадкова не зацікавіліся лекамі і не з'елі іх.

# АРНАМЕНТЫ НА КЕРАМІЦЫ, СКОЛЫ НА КРАМЯНЁВЫМ НАКАНЕЧНІКУ: ПРЫГАЖОСЦЬ, ЯКОЙ ЧАТЫРЫ ТЫСЯЧЫ ГАДОЎ

## Што можна разгледзець у археалагічных тэкстурах

**У Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь чакае наведвальнікаў фотавыстаўка «Археалагічныя тэкстуры: натхненне мінулым».**

— Ідэя праекта «Мінулае мае будучыню: дыялог культуры і навукі» ўзнікла даўно, у ёй шмат перспектыў. Канкрэтна гэтая фотавыстаўка прысвечана толькі аднаму з перыядаў у археалагічнай навуцы — гэта неаліт і бронзавы век. На ёй прадстаўлена зусім няшмат прадметаў, аднак яны вельмі дэталёвыя. Задума экспазіцыі — каб наведвальнік мог падрабязна іх разгледзець. Бо падчас дэманстравання экспанатаў у музейных вітрынах некаторыя рысы і дэталі заўжды застаюцца незаўважанымі, калі не звярнуць на іх увагу спецыяльна. Мы самі, калі пішам артыкулы і займаемся навукова-даследчай дзейнасцю, час ад часу робім для душы, для прыгажосці дэталёвыя фотаздымкі. Яны таксама паспрыялі ўзнікненню ідэі: паказаць тое, што схавана, — дзеліцца **адзін з куратараў праекта, навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі, нумізматыкі і зброі Нацыянальнага гістарычнага музея Вікторыя ТАРАСЕВІЧ.** — Прадметы, якія адлюстраваны на фотаздымках, знаходзяцца ў фондах акадэмічнага Інстытута гісторыі і, думаю, вельмі не хутка будуць прадэманстраваны ўжывую шырокаму колу зацікаўленых. Усе яны ў калекцыі Мікалая Крывальцэвіча, даследчыка дадзенага перыяду... У перспектыве паспрабуем арганізаваць лекцыю з гэтым археолагам, каб у гледачоў з'явілася магчымасць больш даведацца пра экспанаты і, можа, нават патрымаць іх у руках. Варвара Высоцкая — фатограф — таксама не выпадковы чалавек. Гэта наш валанцёр, дзяўчына ездзіць з намі ў экспедыцыі. І паколькі яна любіць гісторыю і некалі таксама хацела быць археолагам, то з цікавасцю адгукнулася на ідэю. Увогуле пытанне, чаму важна папулярызаваць археалогію, вельмі філасофскае. Археалогія тлумачыць, раскрывае нашу гісторыю. Некаторыя яе моманты нават у школьных падручніках застаюцца па-за ўвагай, а нам хочацца, каб такіх прабелаў не было. Хочацца, каб людзі ведалі, што і чатыры тысячы гадоў таму рукамі чалавека, які жыў на тэрыторыі Беларусі, рабіліся такія шыкоўныя і добра аздобленыя прадметы.

У экспазіцыі прадстаўлена больш за 20 дэталёвых фотаздымкаў асобных частак археалагічных знаходак: арнаменты на кераміцы, рэтушаваныя краі крамянёвых сякер і наканечнікаў, гравіроўка на нажы з ікла. Амаль усе артэфакты, якія бачым на фотаздымках, маюць узрост больш за 4 тысячы гадоў і належаць да неалітычнага перыяду і бронзавага веку. Прадметы гэтыя ў асноўным ствараліся ў чыста практычных мэтах, а цяпер уяўляюць каштоўную крыніцу інфармацыі не толькі для археолага, але і для ўсіх, хто цікавіцца і натхняецца мінулым. Прыгожыя формы, вылепленыя рукамі чалавека, кампазіцыі арнаментальнага дэкору глінянага посуду, сколы на крамянёвым наканечніку... Кожны прадмет унікальны, мае сваю непаўторную тэкстуру.

— Мы, у сваю чаргу, таксама натхніліся яшчэ і тым, што набліжаюцца святы, таму дадалі ў археалогію крыху Новага года. Атрымаўся цікавы святочны мікс, нягледзячы на ўсю навуковую накіраванасць і сур'ёзнасць праекта, — кажа **куратар праекта, навуковы супрацоўнік экспазіцыйнага аддзела Нацыянальнага гістарычнага музея Данута ГРЫНЬ.** — Цікава, што калі да гэтага мы падымалі навуковыя тэмы, то дадзеная выстаўка — макраздымкі прадметаў, разглядаючы якія, без анатацыі цяжка нават здагадацца, што перад намі. Але добра пазнаюцца арнаменты, усе рыскі на прадмеце, і гэта можа быць важна для мастакоў, дызайнераў... Гэткая своеасаблівая крыніца для творчасці, якая можа быць пераапрацавана на сучасны лад.

Цэнтральнае месца ў праекце займае археалагічная калекцыя, атрыманая падчас раскопак пад кіраўніцтвам Мікалая Мікалаевіча Крывальцэвіча, старшага навуковага супрацоўніка сектара неаліту і бронзавага веку аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдата гістарычных навук. Асноўная сфера зацікаўленасці даследчыка — археалогія позняга неаліту і бронзавага веку на тэрыторыі Беларускага Палесся. Прыходзьце на выстаўку і пераканайцеся, што на тэрыторыі Беларусі нават у часы неаліту жылі людзі, якія стваралі прыгажосць.

**Алена ДРАПКО.**

# ЛАЦІНСКАЯ ПЕСНЯ БЕЛАРУСКАГА САЛАМОНА

## Першым, хто назваў сябе беларусам, быў паэт, народжаны 460 гадоў таму



Герб Астоя.

**«Спыніся, вандроўнік, хто б ты ні быў, і пабач маленькае і вялікае, найвышняе і найменшае. Ты знойдзеш, што вечнасць пад Богам — нішто, у адно імгненне значнасць вялікіх рэчаў абрынаецца і зніштажаецца».**
**Паэт, народжаны 460 гадоў таму, уключае гэтыя словы ў свой паэтычны зборнік — вядома, на лацінскай мове, бо латынь — гэта ж мова ўніверсуму, тое, па чым пазнаюць адзін аднаго адукаваныя людзі Еўропы...**
**А ў актах Альтдорфскага ўніверсітэта за 2 снежня 1586 года ён запісаўся як «Solomo Pantherus Leucorussus» — Саламон Пантэрус беларус.**
**І гэтак жа назваў сябе ў ліставанні з нямецкім сябрам Конрадам Рытэрсхаўзенам.**
**Такім чынам Саламон Рысінскі ўвайшоў у гісторыю як першы, хто назваў сябе беларусам, а сваю краіну — Leucorossia, Беларусь.**

### Рыцар з мячом у святле месяцовым

460 гадоў з дня нараджэння... Вядома, праз такую часавую заслону мала што можна разгледзець. Нават месца нараджэння гэтага чалавека называлася рознае. Найбольш верагодна, што прыйшоў на свет паэт і мысляр Саламон Рысінскі ў сям'і небагатага шляхціца Хведара Рысінскага ў маёнтку Кабыльнікі на Віцебшчыне. Герб ягоны быў «Астоя» — рыцарскі меч паміж двума паўмесяцамі, памяць пра тое, як рыцар Астоя пры святле месяца знішчыў варожы лагер.

Але Саламону было наканавана завяваць словамі больш, чым мячом.

Нарадзіўся, аднак, ён у часы вайны і выхоўваўся, несумненна, як шляхціц. Будучым ваярам не давалі залішне спесціцца — у маленстве некаторых будзілі стрэлам у столь, маглі паслаць ноччу з якім-небудзь заданнем, напрыклад сарваць з суседняга поля пару каласкоў. Каб страху не меў і прывыкаў без ваганняў выконваць загады. Абвесціць князь ці кароль паспалітае рушэнне, шляхціц мусіць пакінуць баляванні, паляванні ды маладую жонку і тут жа адпраўляцца ў войска. Закранулі гонар — змывай крывёй, учынілі наезд на маёнтак — барані...

Але ясна, што і прага да ведаў была ў Саламона з маленства... Пачатковую адукацыю атрымліваць быў пасланы пры чужым шляхецкім двары. Там здольнага хлопца прыкмецілі прыдворныя князя Юрыя Радзівіла — падобна, гаворка ідзе пра будучага біскупа Віленскага, сына Мікалая Радзівіла Чорнага. Пра гэта сведчыць і тое, што Юрый Радзівіл вучыўся ў Лейпцыгскім універсітэце. Туды ж пры ягонай падтрымцы адправілі Саламона Рысінскага.

На той час Юрый быў яшчэ, як бацька, пратэстанцкага веравызнання, гэта пасля ён разам з братамі зробіцца зацятым каталіком. А пакуль бедны, але здольны Саламон паступае ў Лейпцыгскі ўніверсітэт, царква якога ў 1545-м была асвечана Марцінам Лютэрам, дзе жыў дух Рэфармацыі, а на змену сярэднявечнай схаластыцы прыходзіў гуманізм.

### У кампаніі Сенекі і Рэфармацыі

Няма сумненняў, што ўсе прагрэсіўныя павевы і веды Рысінскі засвойваў, і яму было мала. Бо пасля паступіў у Альтдорфскі ўніверсітэт каля Нюрнберга. І, безумоўна, паэтычны дар дапамагаў прабіцца — тады кожны адукаваны чалавек павінен быў умець напісаць оду, эпітафію, мадрыгал. Недарэмна разам са згаданым сябрам Рытэрсхаўзенам Рысінскі каментаваў рымскага паэта Аўзонія, а таксама Авідзія, Плаўта, Клаўдзіяна, аналізаваў пісьмы Сенекі. Пісаў на лаціне, карыстаўся польскай... Але ствараў і на роднай старабеларускай мове. У віленскіх выданнях Мамонічаў даследчыкі знайшлі тры яго эпіграмы: «На герб ясневельможного пана Остафея Воловіча...» (1585), «На гербы... Льва Сапегі» (1588), «На гербы ясневельможного пана... Теодора Скуміна» (1591). Вядома і тое, што пераклаў ён з беларускай на лаціну вершы яшчэ аднаго нашага паэта таго часу — Андрэя Рымшы.

І хай хто-небудзь усумніцца ў старадаўнасці гісторыі беларускай літаратуры...

### Настаўнік для багатых спадчыннікаў

Чалавек вучоны, пачцівы ды яшчэ і паэт — магнаты былі гатовыя на многае, каб займець такога ў выхавацелі для сваіх нашчадкаў. Нагадаю, што і беларус Сімяон Полацкі, калі патрапіў у Масковію, дзівіў усіх сярод іншага паэтычным майстэрствам і зрабіўся выхавацелем будучага Пятра І.

Саламон Рысінскі таксама пачаў кар'еру дамашняга настаўніка. Вучыў недарасткаў, суправаджаў іх за мяжу — падарожжы па Еўропе лічыліся абавязковай часткай выхавання багатага шляхціца. І ўрэшце трапіў да Крыштафа Радзівіла па мянушцы Пярун, зрабіўшыся прыдворным паэтам і ментарам яго сына, а пасля і ўнука. Менавіта пра грознага Перуна, які атрымаў сваю мянушку за «тактыку выпаленай зямлі», якой карыстаўся падчас ваенных дзеянняў, напісаў сваю вершаваную аповесць Андрэй Рымша.

Гэтыя Радзівілы, як вы разумееце, лагоднымі характарамі не вызначаліся. Калі Рысінскі трапіў у двор Перуна, а даследчыкі лічаць, што гэта было ў 1596 годзе, князь быў жанаты ў чацвёрты раз. У яго меўся сын Януш ад другога шлюбу, ад Кацярыны Астрожскай, якая памерла хутка пасля родаў. Трэці раз Пярун ажаніўся быў з Кацярынай Тэнчынскай, старэйшай за яго, са сваімі дзецьмі. Яна была ўдавой слуцкага князя Юрыя Алелькавіча і багацці мела нямераныя. А ў 1593-м аўдавелы Крыштаф Радзівіл Пярун ажаніўся ў чацвёрты раз, з Альжбетай з Астрожскіх, учыніўшы скандал не тое што на ўсе ліцвінскія землі — на ўсю Еўропу. Справа не ў тым, што чацвёрты шлюб лічыўся грахом, і на яго трэба было ўзяць адмысловы дазвол. Але Альжбета была роднай сястрой другой жонкі Перуна, цёткай Януша Радзівіла. А гэта ўжо лічылася кровазмяшэннем.



Януш Радзівіл, унук Перуна.

Пярун доўга дабіваўся дазволу на шлюб — і зусім не з-за вялікага кахання. А таму, што Альжбета Радзівіл была ўдавой берасцейскага ваяводы Яна Кішкі і мела велізарныя ўладанні, апекуном над якімі якраз і быў прызначаны Пярун. Такі спакусны кавалак, ды пад носам... Альжбета таксама была зацікаўлена ў шлюбе, які абароніць яе ад наскокаў мужніных сваякоў...

Дазволу на шлюб ніхто не даваў, Папа Рымскі не адгукнуўся, бо Пярун быў зацятым пратэстантам, адзінаверцы па ўсёй Еўропе таксама адмовілі... І Крыштаф Радзівіл плюнуў на ўсе ўмоўнасці і абвянчаўся.

Калі падлічыць, атрымаем, што ў час з'яўлення Рысінскага на службе ў Крыштафа Перуна яму было каля 26 гадоў, а Янушу Радзівілу каля 17. Не такая вялікая розніца ва ўзросце, дый Януш хутчэй за ўсё ў гэты час адукоўваўся ў Еўропе. Так што выхаваўчы імпэт, пэўна ж, быў скіраваны на малодшага сына Радзівіла Перуна, таксама Крыштофа, ад шлюбу з Кацярынай Тэнчынскай, які нарадзіўся ў 1585-м.

### На скрыжаванні магнацкіх інтрыг

Ва ўсіх даследаваннях гаворыцца, што Рысінскі быў не проста выхавацель ды прыдворны паэт, але для Перуна стаў дарадцам, аднадумцам у кальвінізме і ў змаганні з арыянамі. Арыянства — адгалінаванне пратэстанцтва — тады набыло моц у княстве, менавіта ва ўладаннях Яна Кішкі, першага мужа чацвёртай жонкі Перуна, яны займелі найбольшую падтрымку. Кажуць, Пярун яшчэ і для таго дамагаўся скандальнага шлюбу, каб, скасаваўшы волю Кішкі, павыганяць блюзнераў, зачыніць на атрыманых з пасагам жонкі землях арыянскія школы ды друкарні.

Рысінскі, добры палеміст, не мог не ўдзельнічаць у дыспутах з арыянамі. Не мог застацца ў баку і ад падзей, звязаных са шлюбам Януша Радзівіла і Сафіі Слуцкай, унучкі трэцяй жонкі Радзівіла Перуна, Кацярыны Тэнчынскай. Сірата і багатая спадчынніца Сафія была самай спакуснай нявестай для прагнай магнатэрыі. Але яе апякун Геранім Хадкевіч і Радзівіл Пярун, нядаўнія сябры, пасварыліся з-за ейнай спадчыны (Хадкевіч тое-сёе ад пасагу падапечнай прыўлашчыў). Януша спусцілі з лесвіцы ў доме нявесты, ледзь не ўзнікла вайна. Кажуць, малітвы Сафіі, якая прызнаная цяпер святой благавернай, дапамаглі ўсё вырашыць мірам.

Сафія памерла, не пакінуўшы дзяцей, і Саламон Рысінскі напісаў вельмі прыгожую эпітафію на яе смерць.

Дзякуючы гэтаму шлюбу, пасля смерці Сафіі ў 1612 годзе Радзівілы атрымалі Слуцк. Там Рысінскі нейкі час жыў і працаваў. Вядома, што Януш зладзіў у Слуцку пратэстанцкую школу, а Рысінскі напісаў для яе статут.

### Два Крыштофы, два Янушы, адзін Саламон

Радзівілы-рэфарматары адчынялі школы і друкарні... І Рысінскі карыстаўся гэтым напоўніцу. У Любчы надрукаваў кнігу пра справы свайго ўладара, Крыштафа Радзівіла, дадаўшы вершаванае апісанне Лівонскай вайны. Выдаў зборнік панегірычных вершаў, у якіх услаўляў дзеянні Радзівілаў. А ў 1618-м — першы ў свеце зборнік славянскіх народных прымавак і прыказак, у колькасці 1800, якія збіраў тры дзесяцігоддзі. Запісваў па-беларуску, перакладаў на польскую і лаціну, шукаў аналагі ў старажытнарымскай і грэчаскай мовах... Каля паўтысячы тых прыказак і цяпер жывуць на Беларусі! Хоць у назве гучыць «польскія», устаноўлена, што збіраў Рысінскі іх у накаволлі Слуцка і Нясвіжа. Вось што перавыдаць бы, з перакладам на сучасную беларускую!

Якраз у тыя гады, калі Саламон пісаў і выдаваў кнігі, ягоныя апекуны ўдзельнічаюць у вайне са шведамі. Пярун, выйграўшы некалькі слаўных бітваў, памёр у 1603 годзе. Крыштаф Радзівіл і Януш праяўляюць сябе як здольныя вайскаводцы. А Януш яшчэ і падымае шляхецкі рокаш супраць караля.


PROVERBIORVM
POLONICORVM
A
SOLOMONE RYSINIO
COLLECTORVM
CENTVRIÆ
DECEM ET OCTO.

Але ў тыя неспакойныя часы з'явіўся ў Саламона Рысінскага яшчэ адзін важны занятак. У 1612 годзе ў Крыштафа Радзівіла, малодшага брата Януша, які пашлюбаваўся з Ганнай з Кішак, нарадзіўся сын Януш. Яго выхавацелем таксама стаў Саламон Рысінскі.

Згадзіцеся, можна заблытацца ў імёнах... Таму і сустракаюцца часам сцверджанні, што Рысінскі з дзяцінства выхоўваў сына Крыштафа Радзівіла Перуна Януша. Але гаворка пра ўнука Перуна.

Януш Радзівіл скончыў кальвінісцкую Слуцкую гімназію, статут якой напісаў ягоны настаўнік, і таксама адправіўся вучыцца ў Лейпцыгскі і Альтдорфскі ўніверсітэты. Але выедзе ён за мяжу ў шаснаццацігадовым узросце, на наступны год пасля смерці Саламона Рысінскага.

Януш, унук Перуна, увойдзе ў гісторыю як зацяты абаронца ідэі незалежнасці Вялікага Княства Літоўскага, як той, хто на сойме гукне — «Прыйдзе час, — паны-паляки да дзвярэй не патрапяць: праз вокны іх выкідваць будзем», намякаючы на падзеі ў Празе, калі немцаў-каталікоў, што нішчылі іх правы, чэхі-пратэстанты павыкідвалі ў вокны парламента. Ён будзе бараніць правы некаталіцкага насельніцтва, заключыць хаўрус са шведскім каралём у спадзяванні на стварэнне незалежнага княства, і загіне, атручаны і абвешчаны здраднікам».

### Нічога, акрамя кніг

Мяркуючы па ўсім, не было ў паэта-філосафа ўласнай сям'і. І, нягледзячы на ўсю сваю вучонасць, асаблівых даброт не здабыў. Цікава, што пры гэтым Рысінскі — ці не адзіны мысляр таго часу, які застаўся свецкага стану.

Захавалася сведчанне пра скананне паэта, які памёр у 1625 годзе ў вёсцы Дзяляцічы Навагрудскага павета: «у першы чацвер пасля святога Марціна, пасля поўдня, калі ён за сталом сядзеў, параліч яго ўзяў і мову яму заняў. Потым ноччу меў кадук цяжкі разоў сорак. Памяці не страціў і бачання, што відаць было з ягоных жэстаў, якія паказваў на напамінанне ксяндза Раманоўскага, дазваляючы на замацаванне яго ў веры і надзеі, аб розных артыкулах. Паліўкі і воды розныя піў, ажно ўжо ў нядзелю вечарам больш глытаць не мог, а ўсё ж такі кадук меў, хоць не так цяжка і не так густа, ажно да самай смерці. А з панядзелка на аўторак на досвітку, у шэсць гадзін, пры пану Набароўскім і пры ксяндзу Раманоўскім, якія давалі малітвы, ды пры іншай моладзі ціхенька заснуў у Госпадзе пасля стагнання цяжкага».

Пахавалі першага чалавека, які назваў сябе беларусам, у Любчы. Ягоны вучань Крыштаф Радзівіл загадаў «над магілай пана Рысінскага высокі і харошы мураваны слуп узнесці і мармуровую таблічку ў яго паставіць, а з тылу каля гэтага слупа харошы курган насыпаць». Засталося ж пасля смерці Рысінскага адзінае багацце — кнігі. Затое, кажуць, іх было больш за тысячу, рэдкія выданні і рукапісы, па значнасці бібліятэка была параўнальная з каралеўскай.

Даследчык Яўген Парэцкі піша: «Творчая спадчына С. Рысінскага, які ад гуманіста-каментатара і даследчыка антычнай літаратуры, выкладчыка старажытных моў змог узняцца да вяршынь гуманізму — выяўленне ў народнай мове роднага краю вытокаў мудрасці, да апошняга часу амаль не даследавалася... Даць сёння аналіз творчасці Рысінскага і выдаць яго творы — гэта значыць вярнуць Беларусі аднаго з аўтараў высокіх помнікаў культуры мінулага».

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

Рарытэты расказваюць

# Сакрэты на срэбры



**У Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага адкрылася выстаўка прадметаў яўрэйскай культуры «Тутэйшы Іерусалім». У экспазіцыі прадстаўлены дзясяткі сярэбраных рэчаў, а таксама іншыя экспанаты XVIII—XX стагоддзя, з прыватнай калекцыі Ігара Сурмачэўскага. Адзін з самых каштоўных рарытэтаў — кніга-гербарый з травамі і кветкамі Іерусаліма 1890 года. Такія сувеніры са Святой зямлі прывозілі паломнікі. Прычым захоўваўся гэты рарытэт у праваслаўнай сям'і. Так, рэчы падказваюць, што народы ўзаемадзейнічалі. І вывучэнне розных культур дазваляе нам лепш адчуваць нашу агульную гісторыю.**

— Маё дзяцінства праходзіла ў сімбіёзе з рознымі традыцыямі. Сярод сваякоў былі праваслаўныя, каталікі, яўрэі. Натуральна, гэта адбілася і на маёй калекцыі, якая называецца «Гісторыя Беларусі». Сёння экспануецца толькі невялікая яе частка, — заўважыў падчас адкрыцця выстаўкі **Ігар СУРМАЧЭЎСКІ.**

З XVI стагоддзя яўрэі масава сяліліся ў беларускіх гарадах і мястэчках і аказвалі моцны ўплыў на мясцовае жыццё: займаліся рознымі відамі рамёстваў, гандлем. У Мінску, напрыклад, у пачатку XX стагоддзя яны ўзначальвалі многія банкаўскія канторы, выступалі заснавальнікамі прамысловых прадпрыемстваў, былі ўладальнікамі большасці гасцініц. Пры гэтым працягвалі захоўваць сваю культуру, мову і рэлігію.



Да пачатку Другой сусветнай вайны амаль палову сталічнага насельніцтва складалі яўрэі, прычым размяшчаліся яны ў розных раёнах горада. Прадметы, пададзеныя на выстаўцы, дазваляюць «зазірнуць» у іх дамы, больш даведацца пра традыцыі.

Аснова прыведзенай калекцыі — сярэбраныя кідушныя кубкі. У экспазіцыі іх прадстаўлена больш за сотню. Па пятніцах у такі рытуальны посуд налівалася віно (лічылася, што яно павінна даліваццa да краёў кубка, бо гэта сімвалізавала дабрабыт). Абрад кідуша з падзякай Богу за дараваныя святочныя дні і суботу здзяйсняўся ў кожным доме іўдзея ці ў сінагозе.

Варта прыглядзецца да ўзораў на кідушах — на іх майстры выразалі гарадскі пейзаж. Менавіта такія выявы на кубках — тыповая асаблівасць нашых зямель, у еўрапейскіх музеях на кідушах у асноўным малявалі раслінны арнамент альбо свяшчэнных жывёл, якіх было дванаццаць. Часта на кідушах майстры стараліся паказаць Іерусалім — той, якім яны яго сабе ўяўлялі, бо многім не тое што не пашчасціла пабываць на Святой зямлі, яны нават карцін з выявамі горада не бачылі. Таму і стваралі мастакі на кідушах свой — тутэйшы Іерусалім, адлюстроўваючы знаёмыя гарадскія пейзажы. Дарэчы, гравюру XVIII стагоддзя, якая сведчыць, як выглядаў Іерусалім, таксама можна пабачыць на выстаўцы. Уражвае, як майстры дасканала выводзілі найдрабнейшыя дэталі складаных малюнкаў на сярэбраным посудзе. Гарадскія пейзажы, выявы сінагог, можна было сустрэць на цукарніцах, графінах, талерках, маслёнках. Росквіт гэтага мастацтва прыйшоўся на сярэдзіну XIX стагоддзя, а пасля ганення на яўрэяў у 1880-х гадах справа пайшла на спад.

Посуд, які выраблялі майстры з Беларусі, карыстаўся шырокім попытам далёка за межамі нашых гарадоў. На жаль, імёны тых майстроў сёння ў нас прызабытыя. Хоць у той жа час іх могуць шанаваць у нашых суседзяў. Як, напрыклад, ювеліра са Шклова Ізраэля Ёселевіча Заходэра. У 1851 годзе майстар з Магілёўшчыны адкрыў сваю майстэрню, якая ў асноўным выконвала заказы з Масквы. Натуральна, пасля таго як у 60-х гадах XIX стагоддзя яўрэям дазваляюць пераадолець мяжу аседласці (пры ўмове што яны з'яўляюцца купцамі першай гільдыі і, валодаюць сумай у 50 тысяч рублёў), майстар перабіраецца бліжэй да кліентаў. У майстэрні, якую ён адкрыў у Маскве, працавала 40 чалавек. Попыт на посуд, які яна выпускала, рос. Але ў 1881 годзе па загадзе новага генерал-губернатара яўрэям забаранілі знаходзіцца ў Маскве і Маскоўскай губерні і на працягу 3—12 месяцаў абавязалі пакінуць гэтыя тэрыторыі. Тады майстар перабіраецца ва Украіну, у Бердзічаў. Вырабы Заходэра адзначаюцца вышэйшымі ўзнагародамі на міжнародных выстаўках, а тавары з яго фабрыкі экспартуюцца ў Турцыю і Аўстра-Венгрыю...

Тора на выстаўцы размешчана ў адпаведнасці з традыцыямі. Так, у сінагозе свяшчэнная кніга іўдзеяў ляжала на поўдзень, у бок Іерусаліма.

Тору клалі на дарагія тканіны (у тым ліку на персідскія дываны). І калі захоўвалі, закрывалі дарагім матэрыялам (гэта маглі быць макаты ці, як Ігар Сурмачэўскі знайшоў сведчанне ў польскіх архівах, слуцкія паясы).

Яшчэ адзін з рарытэтаў расказвае, што яўрэі асаблівую ўвагу аддавалі адукацыі. На выстаўцы размешчаны цдакі — капілкі. Іх дарылі падлеткам, калі тым спаўнялася 13 гадоў і адзін дзень. У іх малады людзі збіралі грошы на сваё навучанне.

Асобны раздзел экспазіцыі прысвечаны побытавай культуры мінскіх яўрэяў — паказваюцца кухня, медны посуд, інсталяцыя інтэр'ера.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Асобы

## У ЯГО КАЛЕКЦЫІ БЫЛІ АЎТОГРАФЫ ТАЛСТОГА І ПУШКІНА

**Сёлета споўнілася 150 гадоў з дня нараджэння заснавальніка Слонімскага краязнаўчага музея, археолага, гісторыка, вынаходніка, вайскоўца, аднаго са знакамітых слонімцаў XX стагоддзя Язэпа (Іосіфа Іосіфавіча) Стаброўскага. У калекцыі Язэпа Стаброўскага былі экспанаты, якія маглі б упрыгожыць стэнды і залы найлепшых музеяў Еўропы: багатая калекцыя крамянёвых і каменных вырабаў часоў мезаліту і неаліту, галава старажытна-славянскага ідала, аўтографы Карамзіна, Дзяржавіна, Льва Талстога, два лісты Пушкіна да яго жонкі Наталлі Ганчаровай, гістарычныя рукапісы XVI—XIX стагоддзяў і многія-многія іншыя рэчы.**

У сямейным альбоме, які захоўваецца ў сваякоў Іосіфа Стаброўскага, ёсць цікавы і каштоўны здымак яго дзеда. Пад фатаграфіяй у альбоме напісана: «Вікенці сын Мацея Стаброўскі, рэгент земскі, гаспадар маёнтка «Кулікі». Памёр ён у 1868 годзе. Пахаваны ў пабудаванай за яго сродкі уніяцкай царкве ў Мілавідах.

Бацька Язэпа Стаброўскага — Іосіф — удзельнічаў у венгерскай, турэцкай і Крымскай войнах. Пахаваны ў вёсцы Орлавічы на Слонімшчыне.

Маці Язэпа Стаброўскага — Людвіка — была родам з князёў Масальскіх. Памерла ў 1902 годзе, пахавана побач з мужам у Орлавічах. Дарэчы, бацька Людвікі Стаброўскай — Адольф Масальскі — прымаў актыўны ўдзел у паўстанні 1863 года. За гэта быў сасланы ў Нерчынскія руднікі. І родны брат маці — Карл Масальскі — таксама ўдзельнічаў у гэтым паўстанні. Ён быў камандзірам аднаго з атрадаў Кастуся Каліноўскага. Яго схапілі, пасадзілі ў клетку і вазілі па вуліцах Слоніма, а пасля расстралялі...

У 1888 годзе Язэп Стаброўскі стаў курсантам Аляксандраўскага ваеннага вучылішча. А потым меў магчымасць яшчэ скончыць Полацкі кадэцкі корпус, Маскоўскі археалагічны інстытут і Вышэйшыя археалагічныя курсы пры Самарскім універсітэце. Быў членам-карэспандэнтам Віленскага аддзялення Маскоўскага археалагічнага таварыства і сябрам Яраслаўскага археалагічнага таварыства.

Першую сусветную вайну Язэп Стаброўскі закончыў у чыне палкоўніка. І з цягам часу навуковыя інтарэсы ўзялі верх над прафесіянальна-ваеннымі. У 1921 годзе ён вяртаецца на родную Слонімшчыну і ўсе свае сілы і веды аддае даследаванню роднага краю. Стаброўскі збірае ўсё, што, на яго погляд, уяўляе гістарычную каштоўнасць.

Восенню 1924 года Язэп Стаброўскі арганізаваў у Слоніме выстаўку старадаўніх дакументаў і кніг, якія калекцыяніраваў шмат гадоў. Выстаўка выклікала вялікую цікавасць у наведвальнікаў, асабліва сярод моладзі. Пасля ўвесь сабраны археалагічны матэрыял і каштоўную калекцыю вырабаў каменнага веку Стаброўскі паклаў у аснову гісторыка-краязнаўчага музея, які расчыніў дзверы перад наведвальнікамі ў 1929 годзе.

Язэп Стаброўскі быў не толькі выдатным археолагам і краязнаўцам, але і таленавітым гісторыкам і вынаходнікам. Ім даследавана больш за 150 курганоў на Гродзеншчыне, напісаны і надрукаваны дзесяткі артыкулаў па краязнаўстве і гісторыі. З Першай сусветнай вайны ён захаваў успаміны і альбом з 300 фотаздымкамі. У свой час знайшлі прымяненне яго шрампель удасканаленага ўзору (зацверджаны ў 1907 годзе Галоўным расійскім артылерыйскім упраўленнем) і тэлефон-прыёмнік удасканаленай канструкцыі (польскі патэнт № 18728).

Летам 1944 года Слонім быў вызвалены ад нямецкіх акупантаў. Музей сталі наведваць салдаты, якія рухаліся на Захад. Стаброўскі праводзіў для іх экскурсіі: паказваў экспанаты і расказваў гісторыю роднага краю...

Да апошніх сваіх дзён (пражыў 98 гадоў) Язэп Стаброўскі даследаваў гісторыю роднай зямлі, вёў перапіску, сустракаўся з навукоўцамі. Пахаваны, як і жадаў, на зямлі былога радавога маёнтка Стаброўскіх у вёсцы Орлавічы на Слонімшчыне. На сённяшні дзень Слонімскі раённы краязнаўчы музей у горадзе над Шчарай носіць яго імя. А ў 2002 годзе на будынку музея была ўрачыста адкрыта мемарыяльная дошка, прысвечаная Іосіфу Іосіфавічу Стаброўскаму, якую выканаў з граніту і падараваў гораду і музею слонімскі скульптар Леанід Богдан.

**Сяргей ЧЫГРЫН.**

Віртуальнае падарожжа

## ЯК АПРАНАЛІСЯ НАШЫ ПРОДКІ?

**Што такое чылка? З якіх дэталяў складаўся нацыянальны строй? Як можна вызначыць, адкуль прыйшлі нашы продкі? Адказы на гэтыя і многія іншыя пытанні вы адшукаеце ў першай анлайн-энцыклапедыі аўтэнтычных традыцыйных строяў Беларусі.**

